PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok
niva_bielastok@poczta.onet.pl
niva_bielastok@skrzynka.pl

№ 3 (2384) Год XLVII Беласток 20 студзеня 2002 г. Цана 2,00 зл.

Снег і палітыка

Яўген Мірановіч

Пасля шматгадовага перапынку ў Еўропу завітала зіма. Такая звычайная, якая раней бывала кожны год і пачыналася напрыканцы лістапада, а канчалася ў палове сакавіка. Ніхто раней нават не здзіўляўся, калі прачнуўшыся пабачыў снегу вышэй вокнаў. У снежні ці студзені гэта была зусім нармальная з'ява. На вёсцы сяляне расчышчалі дарожкі да калодзежа, гаспадарчых будынкаў і на вуліцу. Часам снегу насыпала вышэй агароджы, таму дакапацца да брамы займала шмат часу. Не інакш было ў гарадах. Уласнікі будынкаў мелі вызначаны народнай уладай абавязак рабіць парадак каля сваіх панадворкаў. Інакш міліцыянер мог пакараць немалым штрафам. Нікому аднак не прыходзіла ў галаву разважаць пра нармальную зіму ў катэгорыях катастрофы, як гаварылася гэта ў сродках масавай інфармацыі на пачатку гэтага года.

Найбольш камічна выглядалі сяляне, якія перад тэлекамерамі наракалі, што не маюць хлеба, таму што не даехаў аўтобус і не давёз іх у краму. Куды падзеліся дзежкі і хлебныя печы, якія раней былі асноўнымі элементамі хатняй гаспадаркі? Мяшчане таксама заяўлялі пра сваю трагедыю, таму што не маглі выехаць самаходамі са сваіх панадворкаў на вуліцу. Снег засыпаў дарогі, а камунальныя службы нічога не зрабілі, каб іх расчысціць. Людзі нават не падумалі, каб узяць у рукі лапату і самому аблегчыць сабе жыццё. А калі ўжо падняўся агульны плач прывіслянскага люду, якому снег упаў пад ногі, прэм'ер-міністр Лешак Мілер пачаў склікаць крызісны штаб, быццам бы навала варожых войск наехала на Польшчу.

Сапраўды, апошнім часам узнік свет абсурду. Кожны аўтамабіліст, купляючы бензін, мае абавязак плаціць падатак на пабудову, рамонты і ўтрыманне дарог. Кожны, хто хоча затрымацца ў цэнтры горада, мае абавязак заплаціць падатак, які быццам бы таксама накіроўваецца на дарожную інфраструктуру. На практыцы летам ці вясной дарог ніхто не будуе, а зімою нават невялікі снег выклікае транспартны параліч. У Беластоку затрымацца ў цэнтры горада пры канцы снежня і ў пачатку студзеня было немагчыма. На вуліцы забаранялі гэтага дарожныя знакі, а стаянкі былі занесены снегам. Дзесяткі маладых бамбізаў, якія бегаюць за кожным самаходам і правяраюць талоны на карыстанне стаянкамі, маглі б, напрыклад, з лапатай у руках запрацаваць на сваю плату.

На перыферыйных вуліцах Беластока толькі змена тэмпературы трохі адмяніла сітуацыю. Мяшчане родам з Міхалоўскай ці Замбраўскай гмін не надта ахвотна выходзяць з лапатамі за сваю

[працяг ☞ 3]

Як згарэў Паляўнічы дом у Белавежы

Пётр Байко

Сорак гадоў таму галоўнай тэмай размоў паміж жыхарамі Белавежы быў пажар Паляўнічага дома, які красаваўся ў Палацовым парку і ў якім прымалі найважнейшых гасцей, што апынуліся ў белавежскіх нетрах. Паляўнічы дом раней называлі Свіцкім домам, таму што ў ім затрымоўвалася царская світа. Зрэшты, з думкай аб ёй і быў збудаваны гэты камфартабельны будынак. Узнік ён напрыканцы XIX стагоддзя разам з царскім палацам і апошнімі спадарожнічаючымі галоўнай будоўлі аб'ектамі.

Пажар Паляўнічага дома, да якога дайшло ўначы з 23 на 24 студзеня 1962 года, звязаны са знаходжаннем у Белавежскай пушчы Хрушчова і Гамулкі, якія палявалі спярша на беларускім баку. Калі яны выбіраліся ў польскую частку пушчы, даведаліся аб успыхнуўшым пажары. Павярнулі затым ва ўрадавы палацык, што пабудаваны ва ўрочышчы Віскулі. Праўда, хадзіла і такая версія, што яны паехалі ў Аўгустаў. Там у вайсковым яхтклубе мелі весці перагаворы. Але гэта малапраўдападобна. Наўрад, ці Гамулка рызыкнуў ехаць з госцем ноччу аж у Аўгустаў. Распаўсюджаную, перш за ўсё экскурсаводамі, якія водзяць экскурсіі па Белавежы, версію, што Хрушчоў уцякаў з пажару ў адных трусіках, трэба аднесці да бабуліных казак. Гэты аповед несумненна размалёўвае ўсю гісторыю пажару, але зусім непраўдзівы. Хрушчоў жа нават не паспеў пабываць у Паляўнічым доме. Але ад чаго людская фантазія? Пабываўшы ў Белавежы, можаце таксама пачуць і такі анекдот. Калі Хрушчоў вярнуўся ў Маскву, яго таварышы спыталі: „Ну, што Мікіта, упаляваў у Белавежы зайца?" На гэта той са злосцю меў адказаць: „Не, затое асмаліў сабе яйца!"

Пажар Паляўнічага дома мне самому добра запамятаўся. Мне было тады адзінаццаць з лішкам гадоў. Калі раніцай 24 студзеня, разам з іншымі дзецьмі ішоў я ў школу, здалёк убачыў дым над Палацовым паркам. Хутка даведаліся мы, што згарэў Паляўнічы дом. Сабралася нас грамадка хлапчукоў, якія пабеглі паглядзець месца пажару. Найбліжэй было алеяй побач разбураных руінаў палаца. Але там нас спынілі незнаёмыя мужчыны, наказваючы вяртацца ў школу. Тады мы схітрылі. Добра нам вядомай сцяжынкай па-над ставамі дабраліся на поле, што за Палацовым паркам. Адтуль крыху лепш было відаць дагараючую будыніну. Нейкі напаткаўшы нас жыхар Белавежы перасцярог, каб не падыходзіць бліжэй, бо могуць... страляць! Помню яшчэ, што ўрок у той дзень распачаўся са спазненнем, бо і іншыя дзеці таксама праявілі зацікаўленне пажарам.

Аб прычынах пажару жыхары Белавежы, як і цэлай Польшчы, афіцыйна ніколі нічога не даведаліся. Праўда, праз два дні інфармацыю аб здарэнні падалі „Gazeta Białostocka" і „Sztandar Młodych", але ў гэтых заметках аж кішыць ад непраўдзівых фактаў.

Дзень да пажару ўвесь Палацовы парк быў абстаўлены войскам, а жыхароў Белавежы папярэджана, каб ніхто паблізу яго не круціўся. Чутка пра тое, што Хрушчоў з Гамулкам палююць на беларускім баку, а назаўтра Гамулка будзе прымаць кіраўніка савецкай дзяржавы ў Белавежы маланкава разышла-

[працяг ☞ 4]

Тэрмінал у Семяноўцы ☞ 3

Мікола Яноўскі паінфармаваў, што над чыгуначнымі пуцямі, якія праз Семяноўку ідуць у Беларусь няма павет-раных установак, якія маглі б перашкодзіць вазіць некаторы груз. Расія будзе мадэрнізаваць транссібірскую магістраль, хоча правесці шырокі пуць праз Польшчу і пабудаваць перагрузачны тэрмінал у Чэхіі. Пераконваў ён радных, што будова тэрмінала ў Семяноўцы створыць новыя месцы працы не ў Чэхіі, а ў Польшчы.

Пасля з'езда БГКТ ☞ 4

У адрозненне ад становішча жыхароў Усходняй Беласточчыны і самога Беластока, дзе справа навучання беларускай мовы заўсёды была складанай, варшаўскае асяроддзе згуртаваных у БГКТ беларусаў такіх праблем ужо не мае: нашы дзеці і ўнукі наогул не ведаюць беларускай мовы.

Калядны кісель ☞ 4

Несумненна, гітам сёлетняга праваслаўнага Ражджаства Хрыстова быў аўсяны кісель. Прынамсі так вынікала з калядных перадач у „Тэлеэкспрэсе", галоўным выданні „Навін" і мясцовым „Аб'ектыве". Пані Тамашук, падляшская старажылка, зрабіла ў той дзень агульнапольскую кар'еру...

Іх імёны засталіся ў гісторыі ☞ 5

Напалеон Орда нарадзіўся 11.02.1807 года ў радавым маёнтку Варацэвічы „Чырвоны двор" непадалёку ад Іванава, у сям'і інжынера-фартыфікатара Міхала Орды, які будаваў дарогі і каналы на Палессі. Нейкі час ён быў кіраўніком дваранства павета і адносіўся да той часткі інтэлігенцыі, якая марыла пра адраджэнне былой велічнасці і славы Вялікага княства Літоўскага.

Афон у фатаграфіі ☞ 9

У бельскай ратушы-музеі на вялікіх фатаграфіях адлюстраваны жыццё афонскіх манахаў і іх праца. На здымках паказаны агульны від дваццаці афонскіх манастыроў, многіх скітоў і пустэльняў звонку.

Першы „Сільвестар" ☞ 10

Давалокся я да Балігрода тады, калі „мая" Юзя, не дачакаўшыся мяне, пайшла на забаву з іншым і з сястрой Тэрэзай. Я па просьбе Юзінай мамы, якая мяне не то што любіла, а проста кахала, распрануўся і памыўся. Сеў на ложак, каб памыць змучаныя ногі ў прынесеным паняй Жураўскай тазе і... заснуў.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

ЕС патрабуе следства ў справе беларускіх апазіцыянераў

Прадстаўнік Еўрапейскага парламента Ян Віерсма звярнуўся да прэзідэнта Беларусі з патрабаваннем правесці незалежнае следства ў справе загінуўшых апазіцыйных палітыкаў.

У адкрытым лісце Ян Віерсма, старшыня дэлегацыі Еўрапарламента, члены якой некалькі разоў у год наведваюць Беларусь, выказаў занепакоенасць з прычыны адсутнасці вынікаў у высвятленні г.зв. гучных спраў (так у Беларусі называюць знікненні вядомых апазіцыянераў).

Больш чым два гады невядомымі застаюцца лёсы былога міністра ўнутраных спраў Юрыя Захаранкі (прапаў у маі 1999 г. ля свайго дома), кіраўніка апазіцыйнага Вярхоўнага Савета Віктара Ганчара і яго сябры Анатоля Красоўскага (абодва ў верасні 1999 г. пайшлі ў лазню, з якой ужо не вярнуліся) і аператара расійскага тэлебачання ГРТ Дзмітрыя Завадскага (прапаў у ліпені 2000 г. па дарозе ў мінскі аэрапорт).

Ян Віерсма нагадаў, што ў свой час з'явіліся абвінавачанні беларускіх улад у дачыненні да выкрадання апазіцыйных палітыкаў. Еўрапарламент сцвярджае, што ўлады ў Мінску адкінулі прапанову незалежнай дапамогі ў высвятленні лёсаў загінуўшых апанентаў.

„Толькі незалежнае і яўнае следства можа вярнуць давер да Беларусі і пацвердзіць, што імкнецца яна да пабудовы свабоднага і адкрытага грамадства, у якім законы стаяць вышэй усяго", — напісаў Ян Віерсма, старшыня дэлегацыі Еўрапарламента.

Ягоная намесніца Элізабэт Шрэдтэр у інтэрв'ю для Радыё Свабода выказала спадзяванне, што Лукашэнка і яго акружэнне будуць працаваць у напрамку высвятлення лёсаў прапаўшых палітыкаў і гэта будзе абазначаць, што ў Беларусі ўсё такі дзейнічае Закон. Дадала яна яшчэ, што цяпер у Беларусі наглядаюцца масавыя парушэнні правоў чалавека, а еўрапейскім структурам, напрыклад, АБСЕ, ствараюцца цяжкасці ў галіне супрацоўніцтва з Беларуссю.

„Прапаўшыя людзі — гэта тэма, якая не можа нікога пакінуць абыякавым. У ходзе кожнай сустрэчы на любым узроўні мы будзем яе падымаць пастаянна", — сказала намеснік старшыні дэлегацыі Еўрапарламента Элізабэт Шрэдтэр.

Вядомыя нямецкія аналітыкі Еўрапарламента бачаць у гэтым дастаткова сур'ёзны знак: ніхто ў Еўропе не забыў аб старых давыбарчых грахах афіцыйнага Мінска.

Паводле экспертаў, пісьмо Еўрапарламента трэба разглядаць таксама ў кантэксце больш абмежаванага мандата, які намераны запрапанаваць групе АБСЕ ў Мінску беларускія ўлады.

Як паведаміў адзін з вядомых берлінскіх палітолагаў, тое што на дыпламатычнай мове гучыць: „Хочам выказаць сваю сур'ёзную занепакоенасць у сувязі з прапаўшымі", трэба чытаць так: „З усяго можна зрабіць скандал. У адказ на перашкоды, якія беларускі бок чыніць місіі АБСЕ, Еўропа можа прыняць адпаведныя меры да афіцыйнага Мінска".

Паводле ПАП і Хартыі '97

Памяці Вінцэнта Гадлеўскага

25 снежня мінулага года некалькі дзесяткаў сяброў арганізацыі „Край" наведалі Трасцянецкі лес каля Мінска, каб ушанаваць памяць расстралянага фашыстамі ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага, правадыра беларускага нацыяналістычнага руху.

Зусім нядаўна стала вядома, што 24 снежня 1942 года Вінцэнт Гадлеўскі быў арыштаваны ў Мінску супрацоўнікам СД Хойзэрам, адвезены ў Трасцянецкі лес, ва ўрочышча Благоўшчына, і там расстраляны. Так акупанты расправіліся над вядомым беларускім святаром і палітыкам, лідэрам беларускага нацыянальнага антыфашыстоўскага падполля.

Ва ўрочышчы Благоўшчына краёўцы ўшанавалі памяць Вялікага Беларуса, загінуўшага за волю Бацькаўшчыны. На снезе былі запалены свечкі, ляжалі белыя і чырвоныя кветкі. Краёўцы трымалі сцягі арганізацыі „Край", слухалі прамовы сваіх кіраўнікоў. Шмат гаварылася пра жыццёвы шлях Вінцэнта Гадлеўскага, пра ягонае змаганне, пра ягоныя высілкі па стварэнні беларускага нацыяналістычнага руху.

Ян Каваль

Намесніку бурмістра горада Гайнаўкі Міраславу Морданю
словы шчырага спачування з прычыны напаткаўшага Яго гора — смерці Бацькі
— выказваюць Прэзідыум Грамадскага камітэта пабудовы Музея і цэнтра беларускай культуры ў Гайнаўцы і Клуб радных Беларускага народна-выбарчага камітэта.

Члену Праўлення Грамадскага камітэта пабудовы Музея Аляксею Харкевічу словы шчырага спачування з прычыны напаткаўшага Яго гора — смерці Маці
— выказваюць Павятовае праўленне БГКТ і Прэзідыум Грамадскага камітэта пабудовы Музея і цэнтра беларускай культуры ў Гайнаўцы.

Сардэчна дзякуем за памяць і добразычлівасць усім чытачам і ўстановам, якія павіншавалі нас з Новым годам і Калядамі.

Рэдакцыя

З беларускага друку

Пра тое ды сёе

Галоўныя вароты ў Еўропу

Дзесяцігоддзе з дня стварэння адзначала ў мінулым годзе найбольшая мытня Беларусі „Заходні Буг", у складзе якой цяпер сем пагранічных і тры ўнутраныя пасты. Штосутачна праз мытню праходзіць звыш 7 тысяч адзінак транспарту і звыш 20 тысяч пасажыраў. Калі браць у працэнтах, то праз „Заходні Буг" праходзіць 51 працэнт усіх экспартна-імпартных грузаў краіны, 53 працэнты ўсіх транзітных грузаў і 31 працэнт усяго пасажырапатоку. Словам, „Заходні Буг" — гэта беларускія галоўныя вароты ў Еўропу.

Гасарбайтэры

У 90-я гады тысячы беларусаў пайшлі ў заробкі за мяжу і стварылі новую плынь эміграцыі — эканамічную. Паводле даследаванняў, да выезду ў заробкі за мяжу гатовая значная частка жыхароў Беларусі. У залежнасці ад узросту іх колькасць сярод розных групаў працаздольнага насельніцтва вагаецца ад 16,2 да 41,1 працэнта.

Стратэгія

Беларусь ідзе да змякчэння інвестыцыйнага клімату. Урад пераходзіць на рэалізацыю прынцыпу „аднаго акна". Гэта значыць, пытанні „стратэгіі", метадалогіі і сервіснага абслугоўвання інвестараў будуць разглядацца ў адной інстанцыі — Міністэрстве эканомікі. Цяпер цэнтр Мінэканомікі працуе над новай рэдакцыяй праграмы стымулявання і прыцягнення інвестыцый у эканоміку краіны.

Назіранні

На Беларусі за апошнія дзесяць год каля 20 чалавек змянілі пол. У цяперашні час на ўліку ў Мінскім гарадскім сексалагічным цэнтры знаходзяцца каля 90 чалавек, якія „не згодныя са сваёй палавой прыналежнасцю". Сярод людзей, якія рашыліся на аперацыю па змене полу, ёсць не толькі „чыстыя" транссексуалы, але і гомасексуалы, псіхічна хворыя і „нават псіхапаты". Увогуле ў рэспубліцы афіцыйна налічваецца не больш як 500 чалавек, якія маюць сіндром адмаўлення полу.

Доўгажыхары

Каля 200 жыхароў Гродзенскай вобласці перасягнулі стогадовы ўзрост. Доўгажыхаром „нумар адзін" з'яўляецца Фёкла Баброўская з Малых Луневіч Навагрудскага раёна, якая адзначыла 116-ты дзень нараджэння. Характэрна, што з усіх доўгажыхароў мужчыны складаюць толькі пятую частку. А па колькасці доўгажыхароў лідзіруюць Гродзенскі, Навагрудскі і Ваўкавыскі раёны.

Адкрыцці

Пасля трагічных дзён у ЗША як ніколі часта гучыць песня „Божа, блаславі Амерыку". Яна настолькі папулярная, што яе лічаць другім гімнам. Але мала хто ведае, што аўтар гэтае песні, кампазітар Ірвінг Бэрлін (Ізраіль Бэйпін), нарадзіўся ў Магілёве ў 1888 г. Яго сям'я эмігравала ў Амерыку, калі яму было 8 год.

Вычытаў Рыгор Лясун

З Новага года — новы ціск на журналістаў „Пагоні"

3 студзеня 2002 г. у якасці сведкі на допыт да следчага Гродзенскай абласной пракуратуры Алега Кулевіча быў выкліканы журналіст „Пагоні" Павел Мажэйка. Допыт праводзіўся ў межах крымінальнай справы, распачатай абласной пракуратурай 5 верасня 2001 г. па факце публікацый у 36-м нумары газеты „Пагоня". На думку пракуратуры, некаторыя з іх утрымлівалі паклёп на прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Напярэдадні Новага года тэлефонную размову са следчым меў рэдактар „Пагоні" Мікола Маркевіч, які атрымаў позву ў пракуратуру на 5 студзеня. Следчы Алег Кулевіч заявіў яму, што збіраецца прад'явіць журналістам абвінавачанне ў паклёпе. Пра сур'ёзнасць ягоных намераў сведчыла і пазначаная ў позвах прапанова „пры жаданні" з'явіцца на допыт разам з адвакатамі. Бо звычайна, допыт сведкаў у крымінальных справах, узбуджаных „па факце", адбываецца без удзелу адвакатаў.

Аднак падчас допыту Паўла Мажэйкі следчы заявіў, што ён выкарыстаў тэрмін „абвінавачанне" толькі дзеля таго, каб журналісты з'явіліся на допыт. Разам з тым, супрацоўнікі „Пагоні" сцвярджаюць, што яны „не давалі следству аніякіх падставаў сумнявацца ў сваёй рашучасці давесці гэтую ганебную для пракуратуры справу да канца". Усе пытанні, якія задаваў следчы Паўлу Мажэйку падчас допыту, датычыліся таго, каму належала камп'ютэрная тэхніка, сканфіскаваная пракуратурай у рэдакцыі „Пагоні" пятага верасня. Акрамя таго, спадар Кулевіч запатрабаваў ад журналіста даць характарыстыку на рэдактара газеты.

Напрыканцы следчы ўручыў Паўлу Мажэйку новую позву — на 5 студзеня 2002 г.

Зварот жонак рэпрэсаваных беларускіх палітыкаў да прэзідэнта РП

Пасол Польшчы ў Мінску Марыюш Машкевіч 10 студзеня г.г. прыняў жонак рэпрэсаваных беларускіх палітыкаў. Людміла Карпенка, Святлана Завадская, Ірына Красоўская, Таццяна Клімава і Зінаіда Ганчар перадалі дыпламату пісьмо на імя прэзідэнта Рэспублікі Польшча Аляксандра Квасневскага, які неўзабаве сустрэнецца з расійскім калегам Уладзімірам Пуціным. У пісьме жанчыны звяртаюцца да Аляксандра Квасневскага з просьбай падняць на сустрэчы з Уладзімірам Пуціным пытанне аб загінуўшых, прапаўшых і прабываючых у турмах апанентах рэжыму, аб дачыненні да справы беларускіх улад і аб адносінах да гэтага Расіі.

„У сродках масавай інфармацыі паявіліся сведчанні дачынення ўлад да гэтых выкраданняў, — напісалі жанчыны. — Правядзенне сапраўднага расследавання смярцей і выкрадання апанентаў рэжыму, а таксама пытанні вызвалення палітычных вязняў залежыць не толькі ад нашых намаганняў, але і ад дзеянняў міжнароднай грамадскасці, неад'емнай часткай якой з'яўляецца Ваша краіна і Расія. Мы ведаем, што ў Вас адбудзецца сустрэча з прэзідэнтам Расіі спадаром Уладзімірам Пуціным. Мы неаднойчы звярталіся да яго і іншых кіраўнікоў гэтай краіны з просьбай дапамагчы ў расследаванні. Але канкрэтнага адказу і садзеяння мы не атрымалі. (...) Дзякуем за атрыманую раней падтрымку з боку Вашай дзяржавы".

Пасол М. Машкевіч паабяцаў перадаць пісьмо прэзідэнту РП.

Паводле Хартыі '97

Пераднавагоднія замалёўкі

Спатрэбілася мне паехаць у Гайнаўку заплаціць рахункі ды ўзяць новую тэлефонную кніжку ў тэлекамунікацыі. Быў панядзелак напярэдадні Новага года. Гайнаўская чыгунка прывітала маўклівай цішынёй і заснежанымі перонамі. Станцыя напамінала вымерлае каралеўства. Ніводнага поезда на пуцях, не лічыўшы парожняга састава старых вагонаў, які чакае ў чарзе здачы на лом. Няма дзяжурнага. Вакзальныя памяшканні пустуюць. На аб'яву аб здачы памяшканняў у арэнду адгукнуўся толькі бельскі ПКС, які з цэнтра горада перасяліўся на станцыю і адчыніў тут пачакальню і касы.

Праходжу праз аўтобусную пляцоўку для пасадкі пасажыраў. Ногі грузнуць у снежным балоце. У гэтай твані стаіць некалькі пустых аўтобусаў. Пры першай платформе выстраілася чарга пасажыраў. Празябнутыя, з пачырванелымі тварамі чакаюць аўтобуса. У тэлекамунікацыі хутка аформіў усе справы. Карыстаючыся вольным часам рашыў зайсці ў Павятовае староства, каб знаёмым чыноўнікам прапанаваць „Ніву" з календаром.

— Як ацэньваеце мінаючы год? — пытаю старасту Уладзіміра Пятрочука.

— Добры быў, горш у наступным будзе, — канстатуе староста. — Ужо вядома, што атрымаем на 3,5 мільёна зл. менш субвенцыі. „Абрэзалі" яе цэнтральныя ўлады, латаючы бюджэтную дзіру. Трэба шукаць рэзерваў. А дзе іх знайсці, калі штогод бюджэт напружаны.

— А „Ніву" з календаром маеце? — кідаю на развітанне.

— Не паспеў купіць.

— Дык вазьміце, — рэкамендую.

У староствe больш дзесяці экземпляраў разышлося. Хто сабе браў, хто сваякам. І цешыўся я, калі наступнаму кліенту „Ніву" падаваў. Каб так увесь год было!..

Да адпраўлення цягніка заставалася мне больш паўтары гадзіны. Падаўся я ў магазін „Бядронка", паколькі там ніжэйшыя цэны. У супермаркеце было няшмат пакупнікоў. Не адчувалася тут навагодняй атмасферы. Відаць, людзям не ў галаве карнавальныя забавы. Ды і на справункі грошай няма... Мне закупка абышлася танней каля дзесяці злотых, чым у Чаромсе. Загружаны сумкамі, вяртаўся на станцыю на сваім неадлучным... повары.

У Чаромсе багаж перадаў зяцю, а сам пайшоў на брэсцкі цягнік. Рашыў я за мяжу з'ездзіць.

У цягніку пасажыраў нямнога. Некалькі беларусаў вяртаючыхся дамоў і польскія чаўнакі, якія рашылі апошні раз пакарыстацца старымі законамі.

У Голі (на беларускім баку) пашпартны і мытны кантролі прайшлі спраўна, але цягнік не адпраўляўся. Хутка выявілася, што замерзла стрэлка. Адкрываючы замок, зламаўся ключ. Збіралася на сустрэчу Новага года на заснежаным раз'ездзе. Неўзабаве пагранічнікі справіліся з замком і мы падаліся ў далейшае падарожжа.

У Высока-Літоўску частка палякаў выйшла. Апошнія паехалі далей. І я разам з імі.

На станцыі ў Брэсце хапіла часу зрабіць закупкі і тым жа цягніком вяртацца дадому. Шампанскага мы не купілі, паколькі выявілася, што ў Польшчы яно напалову таннейшае. З Брэста вярталіся адны палякі. Брэсцкія чаўнакі засталіся адзначаць навагодні вечар ў дамашнім зацішшы. Пасажыры раскручваюцца, рыхтуюцца да святочнага пачастунку. На століку пад акном прызямляецца прыгожы торт, які прынесла гайнаўская гандлярка. У вагоне гучаць навагоднія віншаванні і тосты.

— Каб наступны год не быў горшы, — гаварыў лысаваты мужчына, падаўшы чарку худзенькай бландзінцы. Запрашаюць мяне ў кампанію.

— Як у Новым годзе будзе? — пытаюся лысаватага. — Кажуць, што раз у месяц адно можна прывезці паўлітра гарэлкі і пачак папяросаў.

— Пачаткова мо так і будзе, — адказвае мужчына. — Але пасля ўсё ў норму вернецца. З чаго жыць будзем? Гэта ж наша праца. Беспрацоўе і так вялікае...

У Высокім выходзяць беларускія мытнікі, заходзяць польскія. Далучаюцца да кампаніі сустракаючых Новы год.

— За тое, каб у Чаромсе добра кантроль прайшоў, — чую чарговы тост. Мая пляменніца адзначала нараджэнне ўнука. Частавала ўсіх, хто пад руку навінуўся.

Мытны кантроль спусціў удзельнікаў імпрэзы з нябёс на зямлю. Не ўсім чаўнакам пераднавагодняе падарожжа закончылася паспяхова. Я дамоў вярнуўся поўны ўражанняў.

Уладзімір Сідарук

Перагрузачны тэрмінал у Семяноўцы

Мікола Яноўскі.

— У сувязі з тым, што паміж Польшчай і Расіяй вядуцца гаспадарчыя перамовы, прапаную стварыць чыгуначны перагрузачны тэрмінал (станцыю) у Семяноўцы з пабочнымі станцыямі ў Семяноўцы, Вянзкове, Плянце, Хрызанаве, ЦПН Нараўцы, Чаромсе і Зубках-Беластоцкіх, а таксама, падтэрмінала ў Кузніцы-Беластоцкай з пабочнай станцыяй у Генюшах. Да гэтых станцый даходзіць шырокі пуць. Функцыяніравалі яны вельмі актыўна ў сямідзесятыя і васьмідзесятыя гады. На іх пад'язных пуцях перагружалі тысячы тон тавараў у суткі. Чыгуначны шлях Седльцы — Чаромха — Семяноўка — Свіслач — Баранавічы з'яўляецца самым кароткім сухапутным шляхам паміж Еўропай і Азіяй. Стварэнне тэрмінала ў Семяноўцы эканамічна абгрунтаванае. Пасадзейнічае ён гаспадарчаму развіццю Падляшскага ваяводства, Польшчы і дасць тысячы новых месц працы, — напісаў намеснік старшыні Ваяводскай управы ПСЛ Мікола Яноўскі ў адкрытым лісце віцэ-прэм'еру Марку Полю.

Мікола Яноўскі зачытаў гэты ліст на апошняй мінулагодняй сесіі Рады Гайнаўскага павета. Паінфармаваў ён таксама, што над чыгуначнымі пуцямі, якія праз Семяноўку ідуць у Беларусь і раней выкарыстоўваліся для вайсковых патрэб, няма паветраных установак, якія маглі б перашкодзіць вазіць некаторы груз. Расія будзе мадэрнізаваць транссібірскую магістраль, хоча правесці шырокі пуць праз Польшчу і пабудаваць перагрузачны тэрмінал у Чэхіі. Пераконваў ён радных, што будова тэрмінала ў Семяноўцы створыць новыя месцы працы не ў Чэхіі, а ў Польшчы. Мікола Яноўскі будзе шукаць падтрымкі для сваёй канцэпцыі ў прадстаўнікоў польскага ўрада, парламента і самаўрадаў ды ў пасольствах Расіі і Беларусі.

Староста Гайнаўскага павета Уладзімір Пятрочук станоўча аднёсся да прапановы Міколы Яноўскага, аднак у час сесіі не было фармальных галасаванняў у падтрымку гэтай ідэі.

— Аб будове тэрмінала ў Семяноўцы гаварыў я яшчэ перад апошнімі прэзідэнцкімі выбарамі з сённяшнім міністрам сельскай гаспадаркі Яраславам Каліноўскім, — адзначае Мікола Яноўскі. — Справу тэрмінала буду ставіць на бліжэйшым пасяджэнні Ваяводскай управы ПСЛ. Аднак, трэба спяшацца, каб прапанову абнародаваць яшчэ да візіту прэзідэнта Расіі ў Польшчу. А сам міністр інфраструктуры Марк Поль, мабыць, і не ведае пра спрыяльныя ўмовы для адкрыцця тэрмінала.

Аляксей Мароз
Фота аўтара

З бюджэтам на 2002 год

На XXXII сесіі Рады горада Гайнаўкі прыняты быў бюджэт горада на 2002 год.

Дыскусію выклікала папраўка Праўлення горада да праекта бюджэту, якая датычыла перанясення з бюджэту Гайнаўскага дома культуры ў рэзерв 50 тысяч злотых, прызначаных на арганізацыю XXI Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі. Папраўка прадугледжвала выкарыстанне гэтых грошай на арганізацыю Фестывалю царкоўнай музыкі без вызначэння арганізатара мерапрыемства.

— Праўленне горада сумняваецца ці Міжнародны фестываль можа быць арганізаваны ў ранейшай формуле. Вядома, што царкоўныя ўлады не даюць згоды на арганізацыю Мікалаем Бушко фестывалю ў Свята-Троіцкім саборы. Незалежна ад таго, хто будзе арганізатарам мерапрыемства, грошы з рэзерва будуць выкарыстаны на арганізацыю Фестывалю царкоўнай музыкі, — патлумачыў бурмістр Анатоль Ахрыцюк патрэбу адтэрмінавання рашэння аб выкарыстанні гарадской датацыі на арганізацыю фестывалю [царкоўныя ўлады з'яўляюцца ініцыятарам арганізацыі ў Свята-Троіцкім саборы ў маі 2002 года Дзён царкоўнай музыкі — А. М.].

Мікалай Бушко — дырэктар Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі праінфармаваў аб падрыхтоўцы да XXI Фестывалю і выказаў спадзяванне атрымаць ад царкоўных улад згоду на правядзенне мерапрыемства ў саборы.

— Мы робім усё, каб затрымаць Фестываль у Гайнаўцы, — паясняў Мікалай Бушко. — Адзін чалавек прапанаваў арганізаваць яго ў амфітэатры або на стадыёне. Аднак, калі сабор не будзе для нас даступны і не знойдзем месца ў Гайнаўцы, будзем арганізаваць фестываль у іншым месцы.

Радны Веслаў Златкоўскі паддаў пад галасаванне прапанову, каб дафінансаванне перанесці ў рэзерв, як прапанавала Праўленне горада, але з агаворкай, што пойдзе яно на арганізацыю XXI Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі. Яго прапанову падтрымалі 11 радных, 11 радных было супраць, а трое ўстрымаліся — прапанова такім чынам была адхілена. Цяпер 50 тыс. зл. можна будзе выкарыстаць на арганізацыю фестывалю царкоўнай музыкі адвольным арганізатарам пасля адпаведнай пастановы Рады горада.

Радна Гражына Дымінская прапанавала задумацца ці варта фінансаваць утрыманне гарадскога кіно (50 тыс. зл. у год), якое дзейнічае ў Беларускім музеі. Самымі дарагімі інвестыцыямі ў гэтым годзе будуць будова „мушлі" ў гарадскім амфітэатры (330 тыс. зл.) і завяршэнне будовы Белавежскай дарогі (381 тыс. зл.). Дом міласэрнасці „Самаранін" атрымае 13 тыс. зл. на апякунскую дзейнасць, Павятовы аддзел БГКТ — 3,5 тыс. зл. на арганізаванне беларускіх мерапрыемстваў, а аддзел Беларускага саюза ў РП — 2 тыс. зл. на правядзенне народнага фэсту ў квартале Юдзянка.

Спрэчнай аказалася прапанова павышэння аплаты ў дзіцячых садках ад аднаго дзіцяці з 50 на 60 злотых (прапанова ў канцы была прынята). На ўтрыманне прадшколляў у гэтым годзе плануецца выдаткаваць 2 873 тыс. зл. Прагучэлі выказванні, каб абмежаваць доступ да гарадскіх садкоў малечам з вясковых гмін, калі ўлады гэтых гмін надалей не будуць фінансаваць коштаў пабыўкі сваіх дзяцей у гарадскіх прадшколлях (сярэдні месячны кошт пабыўкі дзіцяці ў садку складае 550 зл.).

Аляксей Мароз

Снег і палітыка

[1 ☞ працяг]

агароджу. На вуліцах, калі выпадзе снег, з'яўляюцца сцяжынкі, вытаптаныя людзьмі і коламі самаходаў. Вакол снег ляжыць някрануты. Адзін з маіх пажылых суседзяў заўважыў з нейкім смуткам, што нямецкая акупацыя трывала тут надта коратка і не ўсіх немцы паспелі навучыць працаваць. Другі, вельмі набожны, цалкам пераканаы ў тым, што сёлетні снегапад — вынік апошняга парламенцкага галасавання і выбару посткамуністаў у органы ўлады. Усявышні асцерагае людзей! — гаварыў багамолец, выкідаючы снег ад свае брамы на сярэдзіну вуліцы. Пасля закапаўся там „Паланез", шафёр якога прабаваў прабіцца да пасыпанай соллю вуліцы Пляжовай.

Разам з адлігай з'явілася новае няшчасце. Соль і мароз прывялі асфальтавыя дарогі да такога стану, у якім карыстанне імі стала вельмі небяспечным. Часам немагчыма праехаць, каб не трапіць колам у яму. Дарожныя службы заяўляюць, што грошай на рамонты няма, таму што ўсе ўжо выдалі на соль, якую трэба было сыпаць падчас ападкаў снегу. Выглядае гэта сапраўды як чорны гумар, асабліва калі чалавек усвядоміць сабе, што не прайшло нават паловы зімы і снег можа нанава заатакаваць Польшчу.

Вясной галоўныя дарогі найчасцей напамінаюць швейцарскі сыр, а перыферыйныя перамяняюцца ў балота, праз якое нельга ні прайсці, ні праехаць. А ўсяму вінаватыя немцы, як сказаў бы мой сусед, якія не паспелі пабудаваць усіх патрэбных мясцовым жыхарам дарог. Снег, аднак, нават славяне маглі б адкінуць і аблегчыць сабе штодзённае жыццё. Праблема ў тым, што ніхто ім гэтага не загадаў.

Яўген Міранавіч

Як згарэў Паляўнічы дом у Белавежы

[1 ☞ працяг]

ся паміж жыхарамі. Пажар пачаўся каля першай гадзіны ночы. Віктар Мэрынг, тадышні міліцыянт пастарунка ў Белавежы, успамінаў свайго часу: „Прыбег я ў парк. Якраз прыехала пажарная каманда. Ускочылі мы ў калідор, каб ратаваць тое, што яшчэ можна было вынесці. Будынак гарэў. У канцы калідора стаяў нейкі цывільны і папраўляў сабе перад люстрам гальштук, быццам выбіраўся на баль. Я падбег да яго, а ён мне паказаў значок на лацкане пінжака, накрычаў і загадаў усім выйсці. Стаім перад будынкам, смала капае са сцен, а гасіць не даюць. Калі ўжо было па ўсім, саставіў я пратакол з паказанняў сведкаў, і паехаў у Гайнаўку. Праз тры дні прыехаў асабісты пасыльны Цыранкевіча і забраў усе паперы ў Варшаву. Потым прысудзілі на 3 гады нейкага зусім нявіннага чалавека, быццам бы ён не дапільнаваў сваіх абавязкаў”.

Чэслаў Аколаў, тадышні кіраўнік Музея, успамінае: „Да пажару бег я з працаўнікамі музея і сваёй маці. Людзі з Бюро аховы ўрада прабавалі нас затрымаць. Аднак мы праігнаравалі забарону і ўскочылі ў сярэдзіну будынка. Ратавалі з аснашчэння што толькі маглі. Пажарнікі з белавежскай каманды мелі клопат з тушэннем пажару, бо ціск вады ў гідранце аказаўся надта нізкі. Пажарнікаў з Гайнаўкі чакалі вельмі доўга, бо тэлефонная сувязь з ёю была магчымая ноччу толькі праз Варшаву”.

Прычыны пажару даследавала спецыяльная камісія з прадстаўнікоў пракуратуры, міліцыі і пажарнай аховы. Што яна вызначыла, ніхто не ведае. Справу дакладна засакрэцілі.

У 1989 годзе журналісты „Prawa i Życia”, Данута і Аляксандр Вранішэўскія, прабавалі дайсці праўды. Падаліся яны ў Ваяводскую пракуратуру ў Беластоку, дзе даведаліся, што акта справы пайшлі „на размол”. У Ваяводскай камендатуры міліцыі ўстанавілі, што яна 25 студзеня 1962 г. перадала справу пракуратуры, а тая 31 мая таго ж года пагасіла яе па прычыне недахопу доказаў злачынства.

Частка працэсу вялася тайным парадкам, таму што пры дапамозе працаўнікоў бяспекі дапытвалі членаў Бюро аховы ўрада, якія знаходзіліся ў Доме падчас выбуху пажару. Пракурора Ежы Ратасевіча, які гэтым займаўся, цікавіла ці людзі з абставы не сарганізавалі сабе піяцкай бяседы, у час якой праз неасцярожнасць магло дайсці да зацярушэння агню. Аднак гэтага даказаць не ўдалося. Што і можна было прадбачыць. Усё ж пракурор Ратасевіч паслаў праз пасрэдніцтва Генеральнай пракуратуры ПНР ліст прэм’ер-міністру Ю. Цыранкевічу, у якім інфармаваў пра неадпаведныя паводзіны ахоўнікаў у час пажару. Ці ён наогул дайшоў да адрасата — можна сумнявацца.

У Белавежы людзі задумоўваліся, чаму пажар не застаў ахову ў піжамах, а ў касцюмах? Чаму ахоўнікі не спрабаваліся адпачыць перад днём цяжкай працы? Чаму не дапускалі абслугі да помачы ў ратаванні будынка і аснашчэння? Магчыма, што ў гэты спосаб хацелі скрыць кампрамат. Што гэта магло быць? Доказ выпіўкі ці падрыхтоўванага замаху на жыццё кіраўнікоў дзяржаў?

Версія аб замаху, на першы погляд — несур’ёзная, усё ж магла быць сапраўднай. Віктар Мэрынг апавядаў, што пару гадоў пасля пажару, пры нагодзе нейкай „сустрэчы дружбы”, закрануў ён тэму пажару Паляўнічага дома. Прысутны на сустрэчы савецкі палкоўнік сказаў, што той памятнай ноччу нехта з абставы страляў у Хрушчова, і што гэта не была першая і адзіная спроба адсунуць яго ў такі спосаб ад улады. Некаторыя белавежцы нават чулі ў згаданую ноч выстралы ў беларускай частцы пушчы, але маглі быць гэта таксама выстралы паляўнічых.

Калі б прыняць версію, што ў пушчы фактычна падрыхтоўваўся замах, то не была б гэта першая такая спроба ў Польшчы пазбавіць жыцця Хрушчова і Гамулку. У 1959 г. падчас афіцыйнага візіту Хрушчова ў Польшчу, Эдвард Герак намовіў гасцей, каб у дарозе з аэрадрома ў Межэнцінах пераехаць праз яго роднае Загужэ. І менавіта перад гэтай мясцовасцю ўзарвалася міна, укладзеная ў прыдарожнае дрэва. Падобная сітуацыя здарылася ў снежні 1961 г. На гэты раз міна ўзарвалася перад калонай аўтамабіляў з І сакратаром Уладыславам Гамулкам, выязджаючай з шахты ў Загужы, пасля акадэміі з нагоды Барбуркі. Замахоўца-пірамана нібыта злавілі, але ці ніхто за ім не стаяў? Гэтае і Гамулку не было вядома.

Найбольш праўдападобную прычыну пажару Паляўнічага дома прадставіў сцораж Мікалай Няхода. Ён патаемна апавядаў давераным знаёмым, што да прыезду гэтак вялікіх гасцей пазмянялі мэблю, дываны і шмат іншага аснашчэння. Напалілі нанач у печках і ўсе пайшлі спаць. Пасля поўначы да Няходы прыйшоў у піжаме палкоўнік аховы і заявіў: „Са сцяны выходзіць дым. Мне патрэбна сякера, каб адбіць дошкі”.

Узялі сякеру і пайшлі ўдваіх у той пакой. Фактычна, са сцяны з панеллю выходзіў дым. У гэтым пакоі не было печкі. Панель мела на сваіх злучэннях памастацку высвідраваны дзіркі. І менавіта з гэтых дзірак, якраз пры ложку ахоўніка, ішоў дым. Адбілі дошкі, шугнула полымя. На пачатку доўга не выклікалі пажарнікаў, а калі ўжо тыя прыехалі, ахова доўга трымала іх пры ўязной браме. Потым ужо не было чаго гасіць. Няхода не знаходзіў іншага тлумачэння, як тое, што лянівы ахоўнік укінуў недакураную папяросу ў дзіркі панелі. І ў такі празаічны спосаб меў згарэць будынак.

Праведзеная пасля пажару спецыялістычная экспертыза нібыта паказала, што будыніна пасля вайны ўвогуле не рамантавалася, у сувязі з тым у правадах комінаў узніклі расколіны, праз якія іскры прабраліся найхутчэй унутр дома. Хапіла, каб занялася драўляная панель. Чэслаў Аколаў у сваю чаргу сцвярджаў, што коміны былі праверaны тры тыдні да пажару і ўсе ўказанні былі поўнасцю выкананы.

Якая праўда? Баюся, што мы яе ўжо ніколі не пазнаем. На месцы згарэўшага Паляўнічага дома, на яго фундаменце вырас новы будынак, які здалі ў карыстанне ў верасні 1964 года. Але ён ужо ў нічым не напамінае папярэдняга збудавання.

Пётр Байко

Вачыма паляка

Калядны кісель

Несумненна, гітам сёлетняга праваслаўнага Ражджаства Хрыстова быў аўсяны кісель. Прынамсі так вынікала з калядных перадач у „Тэлеэкспрэсе”, галоўным выданні „Навін” і мясцовым „Аб’ектыве”. Пані Тамашук, падляшская старажылка, зрабіла ў той дзень агульнапольскую кар’еру, бы той спец па кулінарыі ў публічным тэлебачанні Роберт Макловіч альбо бігбрадэрскі Клаўдзій Саўковіч з TVN. Як мала ўсвядомлены, даведаўся я з калядных інфармацыйных сервізаў польскага тэлебачання, што праваслаўнае Божае Нараджэнне ад каталіцкага адрозніваецца, вось, адно калядным кісялём.

Прынамсі ў публічным тэлебачанні паінфармавалі мне, што ў праваслаўных сяброў пачынаецца свята. Бо ўжо ў сервізе Польскага прэсагенцтва (PAP) у той дзень і з навін, якія паказвае тэлегазета на першым і другім канале, даведацца я пра тое не мог. У тэлегазеце ў калядную нядзелю сказалі, што свята пачынаюць грэка-католікі, да таго ж і выключна ў Прыкарпаччыне.

Радыё Беласток, як звычайна, вяло сябе пільна і элегантна. Аднак неяк дзіўна прагучала інфармацыя ў сервізе ў 13 у першы дзень свята. Я пачуў, што сёння ў гайнаўскіх прадпрыемствах „людзей няма ў працы; ёсць толькі дзяжурныя”. Прагучала гэта так, быццам праваслаўныя злосна згаварыліся і самавольна пакінулі работу. Можа, была гэта толькі няўдалая фармулёўка. Або я зноўку перабольшваю.

А, можа, і не перабольшваю, але ж пачала ўва мне кіпець кроў, калі, едучы аўтобусам у першы дзень праваслаўных (і грэка-каталіцкіх) Каляд, у час трансляцыі з Сямятыч у тэлебачанні набажэнства з удзелам мітрапаліта Савы, я ўбачыў, як гмінныя працаўнікі з запалам разбіраюць галоўную ёлку ў Беластоку. Стаіць яна, як штогод, паміж прыходам Святога Духа і саборам святога Мікалая. Так прынамсі гэта бачыцца, калі глядзець з вакон майго аўтобуса. Я дагэтуль не ведаў, што гэтая ёлка — каталіцкая. Тым больш, што, сапраўды, ёй бліжэй да касцёла святога Роха.

Чапляюся, адно раблю, што чапляюся. Можа так, а, можа, і не.

Калі пару гадоў таму пачаў я займацца журналістыкай у Беластоку, дык, як кажацца ў нашым слэнгу, выслалі мяне „да абслугі” чарговай гадавіны паўстання ў гета. Справаздача з урачыстасці ў адной з мясцовых газет знайшлася на „адзінцы”, і, як пасля прызналіся яе ўдзельнікі, была сумленная і нават хвалюючая. Толькі адна яўрэйка, народжаная ў Беластоку, якая тутака жыла ў маладосці, пісьменніца і журналістка Феліцыя Новак, пазваніла мне і далікатна звярнула ўвагу, што я пісаў не пра „жыдоў польскага паходжання”, а пра „палякаў паходжання жыдоўскага”. Той „перастаўкі” ніхто з палякаў у рэдакцыі перад друкам не заўважыў: ні я, ні галоўны, ні сакратар вядучы нумар, ні тым больш карэктаркі. Прыкмеціла тое Феліцыя Новак, і, пэўна, яшчэ і іншыя яўрэі, якія артыкул прачыталі, тым больш, што ён кранаў менавіта іх.

Калі праз самыя розныя памылкі, менш ці больш свядомыя, здавалася б, зусім малаважныя, грамадзяне Польшчы іншай нацыянальнасці ці паходжання, якія ёсць у меншасці, адчуюць сябе абражанымі, заўсёды будзе вінавата большасць. Тым больш, што, як упарта паўтараў Яцэк Курань, меншасць ёсць празмерна ўражлівая, і мае на гэта права, і трэба быць у адносінах да яе вельмі далікатным.

Праваслаўныя Каляды гэта не толькі аўсяны кісель.

Мацей Халадоўскі

PS. Хвала ва вышніх! Шопка-яслі пад Пілсудскім стаяла яшчэ на другі дзень праваслаўных Каляд (аўторак). Не было там, аднак, ні асліка, ні тым больш Тура.

Бачанае з Варшавы

Пасля з’езда БГКТ

Сёння з сатысфакцыяй (а нават чуллівасцю) успамінаю жывучасць колішняга варшаўскага беларускага асяроддзя, якое рэгулярна штомесяц сустракалася ў клубе па вуліцы Сенатарскай, каб правесці супольна некалькі гадзін на размовах (часам гарачых) аб праблемах не толькі нашага этнічнага асяроддзя, паслухаць вершаў і апавяданняў беларускіх паэтаў ці родных песень у выкананні свайго калектыву.

Сёння, калі з гэтага часу прайшлі гады, калі не стала сваёй сядзібы, калі адышлі грамадскія дзеячы, калі ў асяроддзі польскіх беларусаў выявіліся істотныя праграмна-арганізацыйныя розніцы (новыя структуры з амбіцыёзнымі правадырамі), калі шораз больш дакучлівым становіцца эканамічны крызіс краіны, Варшаўскі аддзел БГКТ папаў у культурна-этнічную пасіўнасць.

Да гэтай пары складаную сітуацыю часткова выратоўваў варшаўскі Цэнтр славянскіх выданняў (па вул. Гагарына, 15), дырэктар якога Ян Заброцкі сістэматычна некалькі разоў у год арганізаваў беларускія сустрэчы. Запрашаліся на іх выдатныя спецыялісты ў якасці рэцэнзентаў выбраных выдавецкіх навінак. На жаль, фінансавы крызіс закрануў таксама згаданы Цэнтр і яго існаванне апынулася пад пагрозай, што чыніць нянпэўнай далейшую дзейнасць нашага аддзела БГКТ.

У адрозненне ад становішча жыхароў Усходняй Беласточчыны і самога Беластока, дзе справа навучання беларускай мовы заўсёды была складанай, варшаўскае асяроддзе згуртаваных у БГКТ беларусаў, пераважна людзей сталага і пажылога ўзросту, такіх праблем ужо не мае: роднай мовай карыстаюцца яны час ад часу ў вузкім коле сяброў арганізацыі. Нашы дзеці і ўнукі, выхаваныя пераважна ў мяшаных па нацыянальным і канфесійным прызнаках сужонствах, наогул не ведаюць беларускай мовы і нямнога чулі аб беларускай гісторыі, геаграфіі і культуры, зусім не ўдзельнічаюць у культурна-этнічным жыцці сваіх беларускіх дзядуляў (бабуль амаль няма). Мяркую, што — у адрозненне, напрыклад, ад беластачан — гэтыя маладыя людзі захавалі ў сваіх сэрцах крышку спагады да „людзей з Усходу”. Мабыць, штосьці ў справе мовы трэба было б зрабіць?

БГКТ, нягледзячы на грамадска-культурны характар, калі хоча мець свой удзел у паляпшэнні польска-беларускіх адносін, не можа пазбягаць палітыкі (хаця не заўсёды мусіць быць гэта вялікая палітыка). Паколькі Галоўнае праўленне БГКТ здаўна дружыць з палітыкай (між іншым, наладжвае партнёрскія адносіны з акрэсленымі палітычнымі сіламі), цяжка нам тут, у Варшаве, прыкідвацца, што гэтага не прыкмячаем, што хочам стаяць збоку ад усяго, што датычыць вялікай палітыкі. Аднак праблемы міждзяржаўнага ці прэзідэнцкага рангу не мусяць займаць многа ўвагі. Майма таксама надзею, што аб палітычных поглядах кожнага з нас будзем заяўляць публічна, але без спрэчнага стаўляння справы рубам, асабліва па-за межамі нашай краіны.

Ва ўмовах рэзкага скарачэння ўдзелу моладзі ў дзеяннях нашага асяроддзя, неабходна распрацаваць плоскасці паразумення, а таксама стварыць адпаведныя механізмы для супольнага дзеяння ў найважнейшых справах. Гэтага не зробяць самі маладыя. Напачатак трэба выкарыстаць вопытных людзей, якія маглі б паказаць моладзі, што яшчэ не ўсё страчана, што сёе-тое ўдасца выправіць.

(мз)

Прозвішча і адрас да ведама рэдакцыі.

Іх імёны засталіся ў гісторыі

У цэнтры Брэстчыны, быццам вырваўшыся з палону навакольных балот, у паўднёвай частцы Іванаўскага раёна, недалёка ад Днепра-Бугскага канала, які звязвае блакітнаю ніткаю лёсы дзесяткаў вялікіх і малых паселішчаў на зялёных сваіх берагах, ёсць маленькая вёсачка Варацэвічы, якая нарадзіла ўсяму свету таленавітага і вядомага Напалеона Орду. Але доўгі час імя славутага кампазітара і мастака было вядома не ўсім.

Будучы яшчэ вучаніцай сярэдняй школы дакладнай інфармацыяй пра Напалеона Орду не валодала. Можа таму, што гісторыя была не падрыхтавана, каб вынесці гэта на ўсеагульны агляд. І менавіта ў пачатку 90-х гадоў гісторыкамі-даследчыкамі быў зроблены вялікі ўклад у сусветныя скарбніцы спадчыны, папаўняючы іх такімі імёнамі як Казімір Лышчынскі, дынастыя прадпрымальнікаў Скірмунтаў, Францішак Бруздовіч, Міхал Бутаўт-Андрайковіч і інш.

І адышоўшае на нейкі час у гістарычны нябыт, нібы заблукаўшы ў калючым і хістаючымся вецці сённяшняй гісторыі, быццам занава, яркай зоркай узышло забытае імя Напалеона Орды, нашага слаўнага суайчынніка — мастака і музыканта, кампазітара і публіцыста, педагога і вучонага, які абудзіў глыбокі інтарэс да нашага мінулага, гонар за наш таленавіты і магутны духам беларускі народ.

Напалеон Орда нарадзіўся 11.02.1807 г. у радавым маёнтку Варацэвічы „Чырвоны двор” непадалёку ад Іванава, у сям'і інжынера-фартыфікатара Міхала Орды, які будаваў дарогі і каналы на Палессі. Нейкі час ён быў кіраўніком дваранства павета і адносіўся да той часткі інтэлігенцыі, якая марыла пра адраджэнне былой велічнасці і славы Вялікага княства Літоўскага, памылкова звязваючы свае спадзяванні з імем і палітыкай французскага імператара Напалеона Банапарта. Таму і даў Міхал Орда свайму сыну такое незвычайнае для Палесся імя — Напалеон. Бацька памірае рана і выхаваннем хлопчыка займаецца маці Юзафіна Бутрымовіч, дачка пінскага старасты Мацея Бутрымовіча — эканаміста-рэфарматара, шырокавядомага грамадскага дзеяча таго часу. Унук ім ганарыўся, дзед для яго быў ідэалам. З дзіцячых гадоў хлопчыку прывілі такое ўспрыманне навакольнага свету, бачанне прыгажосці палескай прыроды. Атрымаўшы добрую дамашнюю пачатковую адукацыю, Напалеон у дваццаць гадоў быў прыняты на вучобу ў Свіслацкую гімназію. Адкрыта была яна ў 1806 г. і знаходзілася пад патранатам Віленскага універсітэта. Узровень выкладання і матэрыяльная база тут былі сапраўды высокімі. Не менш высокім быў у гімназіі і дух вольнадумства. Усе сакрэтныя маладзёжныя арганізацыі гімназіі і Віленскага універсітэта дзейнічалі ў цесным кантакце. Членамі былі не толькі студэнты, а таксама некаторыя выкладчыкі.

Многія сябры Н. Орды не скончылі гімназіі, нават некаторыя сталі падсуднымі за дзеянні дзеля волі айчыны. Але Напалеон заканчвае гімназію ў 1823 г. і паступае ў Віленскі універсітэт. І з першых дзён уключаецца ў дзейнасць тайнага студэнцкага таварыства „Заране”. Дарэчы, гэта і стала прычынай выключэння яго з універсітэта ў 1826 г. Тады атрымаў 15 месяцаў зняволення ў віленскай турме.

Пасля вызвалення з турмы вяртаецца ў Варацэвічы, дзе знаходзіцца пад строгім наглядам паліцыі. У 1830-1831 гг. ён прымае актыўны ўдзел у нацыянальна-вызвольным паўстанні. І за мужнасць, праяўленую ў бітвах за свабоду свайго народа, капітан Орда адзначаны самай высокай узнагародай таго часу — залатым крыжам „Воінская доблесць”. А царскімі ўладамі Расійскай імперыі дзеянні Орды былі ацэнены падругому. Ён быў аднесены да злачынцаў другога разраду, а радавы маёнтак падлягаў канфіскацыі на карысць дзяржавы пасля смерці яго маці Юзафіны Бутрымовіч. А самому Орду пагражала ссылка ў Сібір. Каб пазбегнуць ссылкі, Н. Орда вырашае эміграваць у Парыж. Пад чужым імем, у стане „служкі” свайго сябра Ціта Палонскага, пешшу, па шляхах Аўстрыі, Германіі, Швейцарыі, Італіі ён у 1833 г. дабіраецца да горада сваёй мэты, які быў у той час цэнтрам культурнага жыцця Еўропы і цэнтрам беларуска-польскай эміграцыі. А. Міцкевіч. Ф. Шапэн, Ф. Ліст, Дж. Расіні, Дж. Вердзі, Ш. Гуно, А. Бальзак, А. Стэндаль, І. Тургенеў — „залатое кола”, у якое ўвайшоў Н. Орда.

Асабліва блізкія адносіны склаліся ў яго з Фрыдэрыкам Шапэнам, а таксама з Адамам Міцкевічам, які жыў у Парыжы з 1831 г. і якому Н. Орда акампаніраваў на фартэпіяна на папулярных у той час літаратурных вечарах. Займаецца выяўленчым і музычным мастацтвам. Менавіта парыжскі перыяд жыцця прынёс Напалеону славу, прызнанне ў шырокіх колах творчай інтэлігенцыі Еўропы. Пацвярджэннем таго, што Н. Орда быў сябрам славутага на ўвесь свет кампазітара Ф. Шапэна, з'яўляюцца для нас, яго нашчадкаў, нешматлікія лісты. Ф. Шапэн высока ацаніў не толькі выканаўчыя здольнасці, але і кампазітарскі талент. І ў 1838 г. мініяцюры Орды, яго рамансы і песні на словы С. Вітвіцкага і А. Плуга былі выдадзены ў Францыі. Тут, у Парыжы, Орда знаёміцца і з Ферэнцам Лістам, піяністам і кампазітарам сусветнай славы, які прадказаў яму вялікую будучыню як выканаўцу і кампазітару. Аб высокім аўтарытэце Орды ў музычных колах Парыжа, шырыні яго таленту сведчыць і той факт, што ў 1843 г. таварыства акцыянераў італьянскай оперы аказала яму высокі гонар, выбраўшы яго дырэктарам аднайменнай оперы ў Парыжы. Але быць у такой ролі Напалеону давялося не больш двух гадоў. З-за рознагалоссяў акцыянераў тэатр перастаў існаваць.

Н. Орда працягвае займацца выяўленчым мастацтвам, выкладаннем музыкі, кампазітарскай дзейнасцю. Напісана мноства фартэпіянных твораў, больш за два дзесяткі паланезаў. Затым гэтыя творы гучалі са шматлікіх сцэн Францыі, Германіі, Польшчы, Беларусі. Шмат напісана вальсаў, полек, мазурак.

Спадчына Орды сведчыць пра тое, што актыўнай і шматграннай была і яго педагагічная дзейнасць. Тут ён выступае як даследчык і навуковец. У сярэдзіне 1850-х гадоў піша „Граматыку польскай мовы” (для французаў), затым у 1858 г. у Берліне, а ў 1874 г. у Варшаве.

У 1873 г. свет убачыў „Граматыку музыкі” як найвыдатнейшы вынік яго шматгадовай педагагічнай і даследчай працы. Наогул, музычная і педагагічная спадчына Орды перажывае цяпер сваё другое нараджэнне. Расце колькасць прыхільнікаў яго музычнага таленту. Валодаючы выдатнымі здольнасцямі музыканта і музычнага педагога, Орда усё ж аддаваў перавагу выяўленчаму мастацтву. Амаль усё сваё жыццё прысвяціў малюнку — архітэктурнаму пейзажу.

З канца 30-х гадоў дзевятнаццатага стагоддзя пачаў займацца ў студыі П'ера Жырара (1806-1872), знакамітага французскага майстра архітэктурнага пейзажа.

Першыя малюнкі земляка з'явіліся пасля таго, як ён у 1840-1842 гг., вандраваў па Францыі і Рэйнскай вобласці. Затым паявіліся цыклы з паездак па Іспаніі, Партугаліі і Алжыры, дзе на паперы былі адлюстраваны архітэктурныя славутасці Мадрыда і Лісабона.

Здзейсніўшы трынаццаць паездак па краінах Заходняй Еўропы, Орда стварае шматлікія цыклы малюнкаў, многія з якіх і сёння ўпрыгожваюць турысцкія карты і даведнікі.

(заканчэнне будзе)

Вольга САЧЭВІЧЫК

Дзеці новага стагоддзя

Мінуў першы год новага, дваццаць першага стагоддзя, а заадно і трэцяга тысячагоддзя. Праўду кажучы, сімптомы дваццаць першага стагоддзя мне давялося заўважыць ужо ў канцы дваццатага, якраз год таму, напярэдадні новага 2001 года. І трэба сцвердзіць адразу, што тады мне пашанцавала: таўшчэзная бутэлька ад шампанскага, якую запусціў з дваццаці метраў у мой самаход нейкі трынаццацігодак, як толькі я пад'ехала да гаража, грукнула ў бляшаныя дзверы, адбілася ад іх і затрымалася ў дзесяці сантыметрах ад машыны, а заадно і маёй галавы.

Так што можна смела сказаць, што трэцяе тысячагоддзе пачалося для мяне шчасліва. А Божа мой, я ў жыцці мо адзін раз толькі бачыла чалавека, уцякаючага з такой хуткасцю, як той трынаццацігодак, што сігануў у чорную ноч, быццам партызан, выканаўшы сваё заданне. Першы раз уцякаў на Цэнтральным вакзале ў Варшаве хлопец такога ж узросту, але ў руках ён яшчэ трымаў вялізную дарожную сумку, украдзеную ў разгубленага в'етнамца, які беспаспяхова крычаў: „Паліцыя, паліцыя!”, а яго сумка так жа беспаспяхова званіла на ўсе лады трывогу. Во дзе алімпіец, падумалася мне тады.

Сёлета ў Беластоку не было афіцыйнай сустрэчы Новага года на нейкім пляцы. Баяліся тэрарыстаў?! А ў мінулым годзе яны ж яшчэ так не бушавалі, а вось знаёмы падлетак, які вырашыў сустрэць 2001 год на пляцы каля універсітэта, вярнуўся з перабітым (кінутай бутэлькай) носам. Было адкрытае зламанне, значнае перамяшчэнне. Прайшоў дзве аперацыі: пасля першай нос быў крывы і трэба было ламаць яго ізноў, рабіць другую аперацыю.

Дык што там ноч на Сільвестра! Свая ка — шаснаццацігодка „шалікоўцы” злавілі на Рынку Касцюшкі, у самым цэнтры горада, налупілі яго так, што скура на твары вісела, а пасля здзерлі з яго куртку (была яшчэ зіма) і дэманстрацыйна, на вачах прахожых спалілі яе. Хлопец вярнуўся дахаты голы і абдзерты.

Па ўсім было відаць у мінулым годзе, што надыходзіць новая эпоха. Летам чую праз адчыненае акно, як гутараць дзяўчаткі, седзячыя на лавачцы. Гадкоў па восемдзесяць, не больш. Адна расказвае, што яе старэйшая, пятнаццацігадовая сястрычка ляжыць у шпіталі. „А што з ёю?” — пытаецца ў яе сяброўка. „А-а-а, нічога асаблівага, — адказвае малая. — Яна хоча праверыцца, ці не цяжарная”. „Так? А ад каго? — пытае другая. — Ад Марка?” — „Не, мусіць ад Тамаша, — адказвае сястрычка. — Зрэшты, я сама добра не ведаю!”

Калі да знаёмай прыехала з Гданьска чатырнаццацігадовая ўнучка, яна не магла яе ані разу ўзяць з сабой на работу, бо ёй было сорамна. У дзяўчынкі галава была аголена. У адным вуху было сем завушніц, у другім — чатыры. У носе, у губе, а таксама — у пупку блішчэла золата. Бацінкі таксама былі па апошняй модзе — на чатыры нумары завялікія. На руках вышэй локця — татуіроўка. Ну, і як такую людзям паказаць! — не супакойвалася цэлае лета бабуля.

Але ж ва ўсім відаць новыя часы. Ці ж сёння ліцэіст табе скажа: „Пайшла к чорту!” Не, сёння ён табе скажа: „Але ж кніжку я ўчора прачытаў, што за аўтар! Вы...баны ў космас!” І праўда, касмічна, сучасна, небанальна... І аўтару, калі б ён пачуў, была б радасць немалая ад такой апрабаты.

Нядаўна прыйшла да мяне ўнучка-трэцякласніца ліцэя ды кажа: „Ведаеш, што ў нас у школе здарылася?!” Адказваю, што не ведаю, але хачу ведаць. „Стаім на перапынку, — расказвае яна. — Падыходзіць да мяне хлопец з іншага класа, выняў нешта з кішэні і псіхнуў мне нечым у твар. Я хутчэй заплюшчыла вочы, а ён, ведаеш, што зрабіў? — унучка пачырванела, — узяў і пацалаваў мяне ў шчаку. Я думала, што заб'ю гэтага хлопца, а ён мне кажа: калі б я цябе не „замарозіў”, ты б мне ніколі не дазволіла пацалаваць цябе”.

Ну, і гляньце самі, ці ж не дваццаць першае стагоддзе? Вынаходлівыя маладыя людзі... Ат, лепш няхай цалуюцца, чым маюць імітаваць Бен Ладэна, як той пятнаццацігодак у Амерыцы, што самалётам урэзаўся ў хмарачос.

Ада ЧАЧУГА

Зорка

старонка для дзяцей

„Томкавы дзеткі” (злева сядзяць): Магда Дудзіч, Аня Лапінская і Тамаш Суліма („Бацька”), Пётр Сцепанюк, (стаяць злева) Рэната Харытанюк, Аляксандра Багуцкая, Ева Бенедычук, Аляксандра Максімюк, Данеля Дудзіч. Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Зімовыя канікулы

Па пяці месяцах
цяжкай працы
пачынаюцца
зімовыя
канікулы.
Дзеці выязджаюць
на розныя зімнікі,
на вёску
да бабулі і дзядулі.
Там ім здаецца,
што могуць адпачыць.
Бабуля і дзядуля
цешацца, што ўнукі
іх не забываюць.

Шчасце

Шчасце гэта не ёсць
Ні дзеля выпадку
Ні дар ад Бога
Шчасце гэта тое, чаго
Кожны з нас прагне
Сам для сябе.

* * *

Хопіць адкрыць
у глыбіні сэрца
успаміны і няўдачы,
каб заўважыць іншага,
хто чакае шчасця.

Аня Лапінская,
(„Томкавы дзеткі”)

Надыходзяць „Томкавы дзеткі”

Адной з лепшых сустрачанскіх традыцый з’яўляецца тое, што тут заўсёды многа „матэрыялу” на журналістаў. Невыпадкова паяўляюцца новыя воблікі, яны часта — у большасці. Перад дваццатымі Сустрэчамі я ведаў, што буду найстарэйшым з маладых. Дарэчы, я меў быць апекуном адной з рэдакцый, якія неўзабаве ўзніклі. Падборка будучых журналістаў атрымалася даволі выпадковай: тры хлопцы — тры рэдакцыі, вядома, па адным у кожную. Цяжкасць паявілася пры падзеле дзяўчат, якіх амаль 90% паявілася пры сцяне, быццам манекеншчыцы. Якраз не разыходзілася пра прыгажосць, толькі здольнасць да журналісцкай працы. Выратавала нас (мяне, Мішку ды найбольш, хіба, Патрыцыю) сама галоўная, усім вядомая „Зорка”. Пачаўся гандаль. У маім жыцці паявіліся новыя пачуцці — я стаў менеджэрам каманды (амаль футбольнай). Не скрываю, што заўсёды гэтага хацеў, марыў, каб сесці на трэнерскую лаўку вядомага еўрапейскага футбольнага клуба. Розніца ў гэтым выпадку была такая, што я мог без аніякага страху зрабіць выбар. Потым дайшло толькі да „трансфераў” між мамай, і Мішкі. З далейшага ходу Сустрэч магу сказаць, што выбар быў добры — іншы і не мог быць. Каманда „іграла” добра. Напачатку мне здавалася, што ўсё ж будзем атакаваць, а атрымалася прайсці ў абарону ў сутыкненні з іншымі рэдакцыямі. Нашай стратэгіяй будуць „доўгія кросавыя пілкі” (чытайце: бліскучыя артыкулы) і хуткія паваротыназад (чытайце: добрая дыпламатыя і шпіёнства ў іншых рэдакцыях). Рэдактары, зважайце! Надыходзяць „Томкавы дзеткі”.

Бацька Тамаш

Як Томак бацькам стаў?!

Аднойчы ў рэдакцыі Томка Сулімы дзеткі думалі над загалоўкам газеты. Дваццацігадовы Пётр Сцепанюк прыдумаў, што газета будзе называцца „Клён”, а дзесяцігадовая Оля Максімюк выказала сваю арыгінальную думку, у якой яна назвала газетку „Томкавымі дзеткамі” і ўсім карэспандэнтам гэтая назва спадабалася. Наступнага дня ўсе спаткаліся ў святліцы. Усе жартавалі, ды даведаліся, што Томак стаў бацькам.

Наталля К-С, III кл. ПШ н-р 4
у Беластоку („Нарвавік”)



Сёстры: Магда, Данеля і Аня Дудзіч з Ласінкі. Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Сукватарантка

На Сустрэчах „Зоркі” мы пазнаёміліся з выгляду цікавай дзяўчынай, Беатай. Нам далі адзін пакой і я вельмі гэтаму радавалася. Мая радасць, аднак, не працягвалася доўга. Ужо пасля гадзіны я адкрыла яе сапраўдны характар. Яна жудасна смяялася і была такой балбатухай, даслоўна як Мануэля з „Вялікага брата”. Яна так усіх злавала і нервавала, што калі выходзіла з пакоя, мы зачынялі дзверы на ключ, каб яна не ўвайшла. Жыла я з трыма іншымі дзяўчынамі, якія, наадварот, былі сімпатычныя і падзялялі маю думку наконт Беаты. Пасля прыгод усяго дня былі мы вельмі змучаны і хацелася нам спаць. Было б усё ў парадку, калі б не тое, што наша новая „сяброўка” — Беата — нават калі спіць не перастае трызніць і храпці. Памалу вяртаецца ў нас добры настрой, бо наша сукватарантка выязджае заўтра і я займу яе ложак.

Ева Бенедычук,
II „а” кл. гімназіі
(„Томкавы дзеткі”)

Па-над вяршынямі дрэў

Вечар. Халаднавата. Вельмі холадна. Не ведаю, каторая гадзіна, можа пятая. Цяжка нават думаць, калі такі холад.

Часта здараецца, што з хуткасцю маланкі хочам уцячы з хаты. Найлепш далёка ад усяго, што чалавечае. Не памятаю, калі я выйшла з гасцініцы, але бачу, што я прайшла ўжо некалькі кіламетраў. Раптам паявіўся жахлівы вобраз — чорная хмара хлопцаў. Пачалі нешта гаварыць, а праз хвіліну крычаць. Я спалохалася, калі пачалі да мяне набліжацца, я стала бегчы. Спалохалася, затрымалася каля крамы, задыханая пачала ісці. Я нават не заўважыла, што мароз перамяніў дарогу ў ледзяны тракт. Першае, што ўбачыла, гэта халодны месяц над маёй галавой. Я сядзела. Мінула хвіліна, другая і я ўявіла, што паслізнулася і ўпала. Устаць мне памагла згорбленая бабулька. Адкуль яна ўзялася? Сапраўды, не ведаю. Узяла мяне пад руку і паставіла на ногі. Бяззубыя губы сказалі, што ўжо даўно не елі ніякай стравы. На жаль, я з сабой не мела ніякай яды. Абяцала, што прынясу ёй грошы. Падсявдома я не хацела гэтага рабіць, але нейкая сіла мяне прымусіла. Шкада мне стала грошай. Папрасіла бабульку пачакаць мяне, а я вярнулася ў гасцініцу.

Ізноў нейкая дзіўная сіла піхнула мяне назад. Я бегла. Розныя, нецікавыя думкі прыходзілі мне ў галаву, калі ў кішэні звінелі грошы. Цяпер упэўнена я вярнулася на месца. На жаль, след па бабцы прастыў. Нават сляды на снезе зацерліся. Прыдарожны ліхтар асвятляў навакольле. На снезе нешта блішчэла. Незвычайнае! Залатая шпілька да валос ляжала, быццам нехта яе згубіў перад хвілінай. Я разглянулася навокал і хутка схавала шпільку ў кішэню.

Яна напэўна належала бабульцы. Трэба было яе адшукаць. Адзіным месцам, якое кінулася мне ў вочы, быў лес. Здавалася, што цёмны, шыпшынавы лес запрашаў мяне да сябе. Ціхі вецер лёгка гладзіў мой твар, а я заглыблялася ўсё далей і далей. Я адчувала дзіўную лёгкасць. У адну хвіліну захацела падняцца па-над бліскучымі вяршынямі дрэў.

Жах! Хтосьці раптам схапіў мяне за нагу і не пускаў. Я хацела вырвацца ад злой моцы. Яны крычалі. Крык змяніўся ў даволі нескладанае, хаця вельмі дзіўнае пытанне: „Дзе ён?" Але хто? — падумала я. Чаго ад мяне хочуць нячыстыя сілы!? Пытанне гучэла яшчэ некалькі разоў. Голас сказаў: „Маем гадзіну!" Я звар'яцела і страціла прытомнасць...

Выявілася — гэта быў сон, дарэчы, вельмі рэалістычны, але толькі сон... Над маім ложкам стаяў галоўны рэдактар і са здзіўленнем спаглядаў на мяне. Вялікі гадзіннік, які вісеў на сцяне, паказваў палову восьмай. Пасля снедання я глянула на свой ручны гадзіннік...

Адно пытанне хвалявала мяне ўвесь дзень: чаму гадзіннік спяшаецца на дзве гадзіны?..

Рэната Харытанюк



„Томкавы дзеткі" як зажэртая сям'я і журналісты (Тамаш Суліма, Аня Лапінская і Аляксандра Максімюк. Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Каханне і здрада

Такія словы адразу прыпамінаюць тэлесерыялы, у якіх каханне ідзе ў пары са здрадай. Аднак я не думаю пра тэлесерыялы, толькі пра здарэнне на Сустрэчах „Зоркі". Тамаш Суліма вельмі многа часу прабываў з Аннай Манцюк. Я заўважыў тое ўжо першага дня Сустрэч. Нармальная справа, што хлопец хоча пагаварыць з дзяўчынай. Найдзіўнейшае тое, што Тамаш з'яўляецца галоўным рэдактарам газеты „Томкавы дзеткі", а Аня — сакратаром рэдакцыі „Нарвавіка". Спачатку я не звяртаў на гэта ўвагу, Тамаш гаварыў, што ўсведамляе Аню. Ну, няхай гаворыць, але не зашмат. Я пачаў папракаць Томка, што здраджвае сваёй рэдакцыі. Ён не перастаў расказваць іншым аб нашых рэдакцыйных справах. У пятніцу ўвесь вольны час ён правёў з Аняй і яе сяброўкамі — Оляй і Басяй. Сядзеў у іх! Здрадзіў нас. Аднак, трэба сказаць, што сэрца не слуга, не выбірае. Здараюцца пачуцці між прадстаўнікамі нават канкурэнтных рэдакцый.

Пётр Сцепанюк
(„Томкавы дзеткі")

Сустрачанскі „Big Brother"

Адбор, спаборніцтва, прага перамогі. Гэтак жыве дом Вялікага Брата і так жывеш Ты... Такія словы часта чуем па тэлебачанні. Так пакрысе жывуць і Сустрэчы „Зоркі", а дакладней — рэдакцыя пад старшынствам Тамаша Сулімы. Сам загаловак газеты, „Томкавы дзеткі", паведамляе, што наш рэдакцыйны апякун — наш бацька. Можна параўнаць яго з Вялікім Братам, а нашу рэдакцыю — з удзельнікамі шоу „Вялікі Брат". Кожны з нас прымяркоўваецца да сапраўдных удзельнікаў. Найбольш супадае Оля — яна падобная на Мануэлю. У нашым рэдакцыйным доме ёсць узлёты і падзенні. Розніца ў тым, што ў сапраўдным фінале выйгрываюць грошы, а мы выйгрываем веды і многа новых сяброў.

Пётр Сцепанюк
(„Томкавы дзеткі")

Сустрачанскі міні-слоўнік

АЛІМПІЙСКІЯ БАГІ — недасяжныя малойцы са Штума, закватараваныя на другім паверсе, а сустрачанкі на першым — пад пільным наглядам строгіх апекуноў.

ДРЭСЯЖЭ І ЖЭЛЮСІ — алімпійскія багі на роўным грунце, г.зн. ля супольнага вогнішча ў Хмельне.

ДВАНАЦЭТОГО ТРАВНЯ, РОКУ БОЖОГО... — час паводле часопіса „Біельскі Гостінець".

ДРЭШЧЫК ЭМОЦЫІ — сітуацыя, у якой сустрачанкі пачынаюць выяўляць свае эмоцыі на „двухмоўным языку".

ЗАВОЛАЙ ЖАНЭТЭ!!! — таемны лісток, які паявіўся вечарам ў акне на XVIII Сустрэчах „Зоркі".

ПАПЛЯ — дзяўчынка, якая безупынна глядзіць на „сустрачанскую меншасць".

СУСТРАЧАНСКАЯ МЕНШАСЦЬ — ляваністы, „кропля ў Нарве", „майстры на ўсе рукі", сустрачанская „агародніна".

УДЗІЛЬНІК — сустрэчнік, які закідае вуду (у Нарву) на бліскучыя тэмы.

ШЧО — граматычная форма фізіялагічнай дзейнасці на „двухмоўным языку".

(працяг будзе)

Не аглядайце!..

У сённяшні час адным з клопатаў моладзі з'яўляецца залежнасць ад тэлебачання. Усе навокал глядзяць рознага роду тэлесерыялы, „рэаліці-шоу" і г.д. І менавіта ў гэтым праблема. Па-першае, замест зрабіць нешта карыснае, яны засмечваюць сабе розум непатрэбнымі бязглуздзіцамі. Замест безупыннага адсочвання лёсу галоўных герояў бразільскіх тэлесерыялаў, маглі б, напрыклад, прачытаць кнігу. Вось героі перадач тыпу „Амазонкі" або „Лысыя і бландзінкі" не зробяць за цябе хатняй працы і не вернуць табе страчанага часу. Па-другое, усе гісторыі, якія дэманструюцца ў тэлесерыялах — непраўдзівыя, а нават непраўдападобныя. Ці ж у жыцці можна ўлюбляцца дваццаць разоў у тыдзень. Напэўна, не. Такім чынам, звяртаюся да ўсіх людзей — не аглядайце тэлесерыялаў!

Данеля Дудзіч, III „ц" кл. Гімназіі

Польска-беларуская крыжаванка № 3

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 51: Панарама, бор, бал, лазурак, лук, лебедзь, кіт. Спор, Лі, балет, рад, зуб, букет, хабар, моладзь, дар.

Узнагароды — касеты Алеся Камоцкага „Псальмы" — выйгралі: **Наталля Герасімюк** з Махнатага і **Эвеліна Гайко** з Бельска-Падляшскага.

Тарык

Гэта ніякі не бык напароўся быў на Сержыкаву ключыцу. Хоць так напісалі ў лекарскім абследаванні. То ж трэба было саставіць якісь пратакол з выпадку. Суседзі пацвердзілі. Каб страхоўку выплацілі, бо ж Сержык не мог у тое лета рабіць у гаспадарцы. А то ж брат ягоны, старэйшы, Антон, сахарамі, у злосці, піхануў малодшага Путрука. Той на вілы не напароўся, пахіснуўся ды грымнуўся плячом аб сячкарню. Добра, што не галавою, бо і пэўна, у гэты раз пахаваў бы Антошка свайго малодшага брата. А брат у гаспадарцы патрэбны. Бо Антон кароў не ўмее даіць сам. Хоць на трактары можа ездзіць, з усімі машынамі падачаплянымі, усё іншае — таксама, дужы, разбіраецца ўва ўсім, ды да кароў і не падходзіць. Ні рукамі за вымя, ні да трубачак падключыць даярку — ну, ніяк. А нейкі, хоць маленькі, прыбытак у гаспадарцы толькі з таго малака сёння ў людзей.

Надзелі Сержыку на грудную клетку ў павятовым шпіталі штосьці накшталт гарсэта. Толькі галава яму вытыркаецца нябрытая, кудлатая з таго каўняра. А летам горача! І з бальніцы спачатку не выпускалі, тыдні два, аж урэшце, у тым гіпсавым адзенні, адправілі ў вёску. А вазьмі ты стрымай! Ні пачухацца, ні памыцца! А тут у ваколіцу дзявок панаязджала, агратурыстак! Проста адпачываючых, цікаўных да птушак, раслін ды людзей тутэйшых. Ды дзе якую запросіш — хата замуляна, падлогі старэйшы брат, здаецца, бы век не мыў, пасцель аж рудая. Праўда, з мыццём справа простая, гэта ж не прачыкам ці на тары пультацца са сціркай, як гэта бабуля Тэкля рабіла. Бо ж і не нават „Франя" з ручкай на валіку для выцісканння памытага адзення стаіць у лазенцы, а спраўдны „Indesit", аўтаматычны, што праграму на сцірку наставіць, калі трэба — ускіпяціць ваду ў бубне, прапалошча пару разоў, выкруне, адвіруе, і хоць ты адразу навалакай усё на сябе, амаль сухое. Адно кнопку націснеш, папстрыкаеш па праграмах. Ну, чыста камп'ютэр. Во, хто падумаў бы такую тэхніку ў вёсцы!

Выйшаў Сержык на лавачку пад сваім плотам, пад ліпу. Монца прыпякае, ды пад дрэвам здаравей. Каб хоць мацней ветрык той падзьмуў!

Лета! Вясною, вось, прыемней, ды бульбу садзіць трэба. Бульбіну за бульбінай укідаць у разоры. Хоць, вядома, і саджалка ёсць дзе ў каго. Але бульбу садзіш. Рэшту — машына зробіць. І пестыцыды. І здароўе зруйнуюць, і калорадскага жука спляжаць, і іншых вусеняў ды лісценяў, ці як ім там. Дзед Змітро дык больш у гэтым разбіраўся. Паўстагоддзя таму і пасля пляжыў тую стонку і іншую амерыканскую поскудзь з дапамогай хіміі. Таму і Стонкай яго памятаюць у народзе. І дочкі ягоныя Стонкавымі былі, і маладыя Путрукі, старэйшае, Нюркі, не Нюрчыны ці Путруковы, а, па дзеду, Стонкавы. А цяпер, халера на яго, Тарыкавы будуць. Праз таго таракана, што яго Сержык пад гіпсам з гайнаўскай бальніцы прывёз, з тае хірургіі. Чыста было там, не скажаш, але вусатыя таксама чысціню любяць. Кажуць, хай згіне і племя чалавечае ў якім катаклізме, і ўся жывёла малая ды вялікая, а гэтых гадаў і несусветны мароз не вымарозіць, ні пякельны агонь, і застануцца яны, не дай Бог, адзінымі жыхарамі нашае планеты. А ў вёсцы Вербаўцы — як на цуда якое прыходзяць дзівіцца людзі, на таго Тарыка, што яго Сержык прывёз пад пазухай з павятовага места. Дзед Міхаль памятаў падобных, што плодзіліся па нашых вёсках, гэтых самых, тараканаў ці там прусакоў, дык яны чарнейшыя былі. Але ж не як блашчыцы — во, дык як тая смярдзючая поскудзь кусалася! А таракан не ўкусіць, сам ён мяккацелы, адно тыя вусішчы і ягоная мітуслівасць нейкі жах наводзяць. Але ж адзін — не такі страшны. А ўцякаць ён і не збіраўся. Астаўся жыць у Путрукоў, у перакуленым слоіку на кухні. І з нейкай шкадобай і спачуваннем азываліся хлопцы пра сваю новую худобу:

— А ён, бедны, так як і мы тутака, жыць дык жыве, з голаду не памрэ, роскашы таксама не ведае, хоць яму мала трэба... Але ж і не размножыцца. Адкуль яму ўзяць бабу? То ж з Гайнаўкі не прывязеш. Тараканіху дык маглі б і сілай злавіць, што там! А да нас ні сілай, ні ласкай не сцягнеш кабету. А пазабаўляцца хочацца, калі ўжо жыць няма як.

— Дык прывезці трэ яму калегу, — раздумваў уголас Сержык. — Весялей будзе яму жыць у слоіку, патомства мець не будуць, бо ж усю вёску спаскудзілі б, чыста як за санацыі было б...

— Га? З чым? — перапытаў дзед Міхаль, адвесіўшы жоўтую ад тытуню губу з кропелькай сліны. — Ты, Сержык, пра санацыю што ведаць можаш! Тараканы дык тады былі, ну, да вайны, не тое, што цяпер! Гэты ваш Тарык — адно смяхоцце! А блашчыцы!..

— Вы ўжо соты раз пра тыя блашчыцы! Пашкадавалі б Тарыка! Калі б падгадаваць нам з дзесятак самчыкаў, дык маглі б гонкі арганізаваць. Вядома, спачатку дык трэба было б іх патрэніраваць, прыручыць, каб не разбегліся... На што яны лакомыя... Тараканы... Каню ці слану ў цырку даюць за штукі па костачцы цукру... Тарыку хапіла б крышынка...

— Ну, вядзі мяне, Сержык, паказвай, чаго навучылі вы Тарыка. Чым яго частуеш, што ён такі рахманенькі?

— Есць усё, не кажу, што многа. Ваду п'е.

— А як з гарэлкай? Ужывае?

— Адной не чапае. Але, калі разбавіць, дык не супраць... Ідзем, там хлопцы з Тарыкам гуляюць. Мы само бычка зарэзалі...

Сержык з крэктам падняўся з лавачкі, трымаючыся за плот падаўся ў летнюю кухню. За ім пачыкіндаў дзед Міхаль. З мураванкі з шэрых пустакоў з адчыненага акна з парудзелай выдзьмутай ветрам фіранкай далятаў гоман басавітых галасоў.

— Дзе Тарык? — кінуўся Сержык да хісткага стала. — Дзе слоік?

— Памёр твой Тарык. Мы яго толькі што пахавалі. А цяпер у нас мярліны! — падняў шклянку старэйшы Стонкаў.

— Усе мы, кавалеры з усяе гміны, вельмі шкадуем беднага Тарыка! — слязліва прамовілі хлопцы, глытнулі рускай гарэлкі і закусілі вараным бычком.

Міра Лукша

Нашы самадзейнікі

Ніна Цыванюк

Хто не ведае Ніны Цыванюк з Гарадка, адной з заснавальніц (побач з Нінай Мушынскай) гарадоцкага хору ледзь не паўстагоддзя таму!

Калі адышла з калектыву Ніна Мушынская, Ніна Цыванюк узялася кіраваць хорам „Расспяваны Гарадок" і вядзе яго далей, абапіраючыся на падмогу шматгадовага музычнага кіраўніка і дырыжора Сцяпана Копы.

Ніна Цыванюк выступае таксама як салістка. На мінулагоднім Фестывалі беларускай песні яна заняла першае месца сярод салістаў у катэгорыі аўтэнтычнага фальклору.

Ніну Цыванюк нельга параўнаць з нікім! Яна спявае не толькі дзеля таго, каб выказацца, але і дзеля людзей. Не для ўзнагарод яна гэта робіць, а з патрэбы душы.

Спявачка вышукоўвае старыя, бабуліны песні, выцягвае іх са свайго зачараванага куфэрка на свет Божы і прыносіць нам у падарунку. Але Ніна Цыванюк і сама піша тэксты, а таксама музыку да іх.

Са сваёй песні яна патрапіць зрабіць свайго роду „шоу", а да таго — аднаасабовае.

І хаця спявачка не мае занадта шырокага дыяпазону, то мае іншыя добрыя бакі свайго мастацкага выказвання.

Часамі, здаецца, вышэйшыя ноты маглі б узбагаціць яе спеў. Дык мо варта было б спрабаваць, чаго варты наш голас, і сягнуць вышэй, каб не затрымлівацца ў адной актаве.

Адрыяна Семянюк

Фота з архіва

Пушча святлом маляваная

У Гарадской публічнай бібліятэцы ў Гайнаўцы з 14 снежня 2001 года працуе выстаўка фатаграфій Уладзіслава Завадскага „Пушча святлом маляваная". На вялікіх каляровых фатаграфіях паказаны лясныя краявіды і дэталі пушчанскіх дрэў. Адпаведна выкарыстоўваючы святло і лясныя цені Уладзіслаў Завадскі па-мастацку сфатаграфаваў грыбы, лісты, дупло і іншыя дэталі дрэў. У бібліятэцы экспануецца фатаграфія, узнагароджаная некалькі гадоў таму на Агульнапольскім фатаграфічным конкурсе ў Нараўцы, на якой аўтар цікава паказаў паверхнасць кары дрэва. Лясныя краявіды мастак фатаграфаваў у Белавежскай пушчы, каля ракі Лясная — вясной, восенню і зімой.

— Летам дрэнна фатаграфаваць лес, бо зялёная лістота закрывае дрэвы ад святла і відаць толькі гушчар, а я стараюся паказваць прыгажосць пушчанскіх краявідаў, — заяўляе Уладзіслаў Завадскі. — Фатаграфіі на выстаўку пачаў я выконваць пяць гадоў таму. Выкананне здымка патрабуе многа часу. Фатаграфуючы грыбы, якія экспануюцца на выстаўцы, я паўгадзіны ляжаў з фотаапаратам у чаканні адпаведнага асвятлення.

У чытальнай зале Гарадской бібліятэкі паказваюцца рысункі Магдаліны Агела з Гайнаўкі — настаўніцы англійскай мовы ў Белавежы. На выстаўцы эскпануюцца вялікія працы: партрэт, абстрактныя работы і прыгожа нарысаваны Свята-Троіцкі сабор у Гайнаўцы.

Аляксей Мароз

„Zabytki" Падляшша

— Для шмат каго з палякаў Падляшша — апошняя брама да зачыненай навекі краіны Крэсаў, — піша ва ўступе да найноўшага нумара, пятага, часопіса „Zabytki" („Помнікі") яго галоўны рэдактар Гжэгаж Б. Мазур. Журнал у пераважаючай частцы прысвячаецца шматнацыянальнаму і шматкультурнаму нашаму рэгіёну. Да багатага і па-мастацку ілюстраванага здымкамі часопіса далучаны кампакт-дыск з царкоўнай музыкай, якая гучала на гала-канцэрце XX юбілейнага Фестывалю царкоўнай музыкі ў Гайнаўцы, а таксама атрацыйная карта помнікаў даўніны Падляшскага ваяводства, якая была выдадзена пры дапамозе Ваяводскага захавальніка помнікаў. І вось размова з захавальнікам (ужо адкліканым) Антоні Аляксіцкім адкрывае нумар гэтага часопіса. „Сённяшняе Падляшскае ваяводства ёсць надалей у вялікай меры прадаўжальнікам традыцый шматнацыянальнай Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў", — сцвярджае Аляксіцкі.

Пра містычныя месцы Падляшша распавядае Пшэмыслаў Пільх. Аўтар апісвае гісторыю праваслаўных храмаў, расказвае пра драўляныя крыжы і мячэці на нашай тэрыторыі. „Фестываль спяваючай душы" — артыкул вандроўніка і краязнаўцы Тамаша Млёнцкага пра ўдзельнікаў, арганізатараў і падзеі XX Фестывалю царкоўнай музыкі ў Гайнаўцы. Сярод шэрагу артыкулаў прыцягвае ўвагу тэкст таксама аўтарства Т. Млёнцкага „Гатэль «Мікалай II» у Белавежы" пра гісторыю, гаспадароў і гасцей белавежскага Царскага палаца, аздоблены здымкамі з мінулага стагоддзя (са збораў Белавежскага нацыянальнага парку). У „Zabytkach" публікуюцца таксама два тэксты Ежы Самусіка, лекара і гісторыка з Беластока. Адзін з іх расказвае пра палацавы комплекс у Харошчы, другі — пра дворскія збудаванні ў Цісаве. Падляшскія старонкі завяршаюць літаграфіі бельскай мастачкі Маргарыты Дмітрук, былой студэнткі аддзялення графікі акадэміі мастацтва ў Мінску і Варшаве. Разам з імі — верш Надзеі Артымовіч па-беларуску і ў перакладзе на польскую мову Міколы Ваўранюка.

Пры кожным тэксце — рэзюме па-англійску.

Апошні нумар часопіса „Zabytki" — сапраўдная прамоцыя нашага рэгіёна, да таго ж на вельмі высокім эдытарскім і мерытарычным узроўнях. Нешматлікія ўжо экземпляры гэтага журнала можна яшчэ купіць у беластоцкім клубе EMPiK.

Мацей Халадоўскі

Рускі манастыр св. Панцялеймана.

Афон у фатаграфіі

У музеі ў Бельску-Падляшскім 14 снежня мінулага года адкрылася фатаграфічная выстаўка „Святая Гара Афон”. Паказаны на ёй каля 200 фатаграфій Збігнева Дзванкоўскага, фатографа з Гайнаўкі. Побач здымкаў, якія выкананы былі ў 2000 і 2001 гадах, размешчаны рэпрадукцыі фатаграфій, зробленых нават некалькі дзесяткаў гадоў таму.

Адкрыццё выстаўкі ўдастоіў епіскап Бельскі Грыгорый. У мерапрыемстве прысутнічаў Марк Якімюк — рэдактар Праваслаўнага выдавецтва „Братчык”, якое разам з Праваслаўнай парафіяй у Пасынках было суарганізатарам выстаўкі. У бельскую ратушу прыйшлі людзі, якія былі ўжо на Святой Гары Афон, асобы, якія могуць туды паехаць і тыя, якіх туды не пускаюць — жанчыны. Пытанні, якія ставілі бяльшчане аўтару здымкаў часта тычыліся штодзённага жыцця на Гары Афон.

У бельскай ратушы-музеі на вялікіх фатаграфіях адлюстраваны жыццё афонскіх манахаў і іх праца. На здымках паказаны агульны від дваццаці афонскіх манастыроў, многіх скітоў і пустэльняў звонку.

— Не ўсюды дазвалялі фатаграфаваць унутры манастыра, — кажа Збігнеў Дзванкоўскі. — Мае фатаграфіі папаўняюць рэпрадукцыі старых здымкаў, на якіх можна ўбачыць, напрыклад, паховіны манаха. На Афон упускаюць абмежаваную колькасць замежных паломнікаў ці турыстаў і таму адчуваецца там вялікі спакой, цішыня і святасць. На падставе фатаграфій і расказаў цяжка перадаць атмасферу Афонскай гары, але можна яе наблізіць. Жыццё там намнога спакайнейшае чым у нас і дае падставы да рэфлексій над жыццём без цывілізацыі, якая падганяе нас наперад.

— Выстаўка аб Святой Гары Афон прыцягвае ў бельскую ратушу натоўпы людзей. Аднак, мы не можам адтэрміноваць яе закрыцця, бо з 25 студзеня гэтага года выстаўка будзе паказвацца ў Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку, а пасля ў Беларускім музеі ў Гайнаўцы, — паінфармаваў Марк Якімюк, рэдактар „Братчыка”.

Дублікаты фатаграфій паехалі на выстаўку ў Бразілію, дзе будуць паказвацца ў праваслаўнай парафіі ў Рыодэ-Жанейра. Іншыя дублікаты будуць экспанавацца ў Падстаровай школе н-р 6 у Гайнаўцы і пасля на прыхадскіх выстаўках. Фатаграфіі з выстаўкі ў Бельску-Падляшскім паказваліся ўжо ў Познані і Гнезне, а частка здымкаў, выкананых яшчэ ў 2000 годзе, выстаўляліся ў мінулым годзе на Святой Гары Грабарцы, у Варшаве і Гайнаўцы: у доме культуры, белліцэі і Свята-Троіцкім саборы.

Аляксей Мароз

Фота Збігнева Дзванкоўскага

Хутар між Сынкоўцамі, Кудраўкай і Сідэркай.

Вёска пенсіянераў і дзяцей

У Сынкоўцы найзручней дабрацца з гміннага Новага Двара. Ёсць яшчэ і дарога з Кудраўкі, а нават з Сідэркі, аднак лясныя звіліны апошняй ведаюць толькі тутэйшыя. У Сынкоўцах сёння жыве каля шасцідзесяці душ. Прыемна здзіўляе, што ў заселай на канцы свету вёсцы ёсць грамадка дзяцей. Шасцярых дзяцей, у тым ліку аднаго гімназіста, возіць у навадворскую школу аўтобус. Апрача іх ёсць яшчэ пяцёра дашкольнікаў...

Ідучы праз вёску зачапляю пажылога мужчыну, які седзячы назірае за каровкай. Даведаўшыся, хто я, вядзе далей.

— Гэй, беларусы! — заклікае ка мне будаўнікоў дома.

Дом ставіць пажылы але рухавы жыхар Беластока. Беласток са сваім гоманам і растучым беспрацоўем не захапляе ўжо пажылых людзей і некаторыя з іх ахвотныя вярнуцца на радзіму. У Сынкоўцах жыве многа пенсіянераў. Два чалавекі працуюць у Беластоку, а апошнія жывуць з гаспадаркі. Трымаюць пакрысе жывіну — кароў і свіней. Малако возяць у Новы Двор, калейкаю — па дню ад бітона. Свіней і быдла прымаюць на *спэндзе* ў Новым Двары — у аўторкі. Прыватнікі прымаюць як пападае, а нават і ў вёску прыязджаюць. У вёсцы два кані — для вывазкі і баранавання. Поле абрабляюць трактары — у Сынкоўцах іх каля дваццаці. І каля пятнаццаці самаходаў.

Калі хто захварэе, то ў Новым Двары лекар прымае штодзённа, ды яшчэ раз у тыдзень другі лекар прыязджае з Дубровы. З пакупкамі няма клопатаў, бо кожны дзень вёску наведваюць па дзве-тры аб’язныя крамы — з Сідры, Саколкі, Дубровы, Беластока. Водаправода ў Сынкоўцах няма, але маюць цягнуць. Тэлефон ужо маюць усе ахвотныя.

На канцы Сынкоўцаў, з боку Кудраўкі, узвышаецца вялікі крыж. Падобны крыж стаіць і з боку Новага Двара.

У Сынкоўцах адна каталіцкая сям’я, а апошнія — праваслаўныя. Прыход у Новым Двары — пяць кіламетраў ад Сынкоўцаў. Цяжка пенсіянерам так далёка хадзіць, а самаходы ў святочныя дні не ездзяць. У будзень можна пад’ехаць на школьным аўтобусе, а ў свята ў царкву трэба дабірацца на сваім транспарце. Нямногія могуць пад’ехаць з тым гаспадаром, які вязе малако...

Аляксандр Вярбіцкі

Фота аўтара

Таварыства любіцеляў царкоўнай музыкі

У будынку Школы псаломшчыкаў у Гайнаўцы 28 снежня мінулага года адбыўся ўстаноўчы сход Таварыства любіцеляў царкоўнай музыкі, якое будзе дапамагаць Грамадскаму арганізацыйнаму камітэту ладзіць у маі гэтага года Дні царкоўнай музыкі.

Грамадскі аргкамітэт, якому старшынствуе мітрафорны пратаіерэй Міхаіл Негярэвіч, складаюць па пяць прадстаўнікоў ад Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы і мясцовых самаўрадаў.

— Яшчэ канчаткова не вырашана назва мерапрыемства. З’явілася прапанова ўвесці ў назву слова фестываль, — сказаў айцец Міхаіл Негярэвіч. — Мерапрыемства будзе мець свецкі і міжнародны характар, паколькі запрашаем замежныя хоры, але будзе яно згоднае з канонамі Праваслаўнай царквы.

Ва ўстаноўчым сходзе Таварыства любіцеляў царкоўнай музыкі прынялі ўдзел кіраўнікі мясцовых самаўрадаў: староста Гайнаўскага павета, бурмістр Гайнаўкі і войт Гайнаўскай гміны, якія сталі членамі таварыства.

— Супольна з аргкамітэтам Дзён царкоўнай музыкі вырашылі мы прыняць больш шырокую формулу арганізацыі мерапрыемства і дзеля гэтага ангажаваць большую колькасць людзей з Гайнаўкі і навакольля. Гэтаму мае садзейнічаць Таварыства любіцеляў царкоўнай музыкі. Я перакананы, што яго дзейнасць падтрымаюць прадстаўнікі самаўрадаў Гайнаўскага і іншых паветаў, дзе жывуць праваслаўныя, хаця дзейнасць таварыства не абмяжоўваем толькі да праваслаўных, — сказаў староста Уладзімір Пятрочук.

Таварыства любіцеляў царкоўнай музыкі будзе абапірацца на грамадскай працы яго членаў. Арганізуючы сімпозіумы, выстаўкі і іншыя папулярызатарскія мерапрыемствы таварыства будзе дзейнічаць на тэрыторыі Польшчы і за яе межамі.

Заснавальнікі прынялі статут таварыства, які мэтай дзейнасці ставіць папулярызацыю духовых каштоўнасцей Праваслаўнай царквы, духова-мастацкай прыгажосці царкоўнай музыкі і дабрачыннай ды гуманітарнай дзейнасці.

У выніку галасавання старшынёю таварыства стаў Ян Андраюк (старшыня Гайнаўскага гуртка Праваслаўнага брацтва св.св. Кірылы і Мяфодзія), а яго намеснікам — пратаіерэй Славамір Хвойка (вікарны свяшчэннік Свята-Троіцкага сабора і дырэктар Гайнаўскага Інстытута праваслаўнай культуры). Сакратаром выбрана была Нэля Шчука (намеснік старшыні Праваслаўнага брацтва), скарбнікам стаў Якуб Астапчук (старшыня спартклуба „Пушча”), а членам управы — Ірыней Лаўрашук (рэгент з Бельска-Падляшскага, выкладчык Гайнаўскай школы псаломшчыкаў і Бельскай музычнай школы).

Аляксей Мароз

Першы „Сільвестар”

Святкаванні Сільвестра ў мяне заўсёды былі прыкрымі. Відавочна каталіцкі Сільвестар, таксама як Багаты вечар у праваслаўных не злюбіў мяне, то і я перастаў шанаваць яго, бо любіць яшчэ не паспеў.

Сільвестар з 1947 на 1948 год меў быць для мяне першым у польскім асяроддзі, з польскай дзяўчынай у Балігродзе. Туды наша 3 стралковая рота КБВ трапіла восенню 1947 года. Я быў намеснікам камандзіра ўзвода, але практычна выконваў абавязкі камандзіра, бо афіцэраў тады яшчэ не хапала. Ротай камандаваў паручнік Кучэўскі, а ягоным намеснікам быў падпаручнік Рыгель. І гэта былі ўсе афіцэры ў роце, якая налічвала больш за 200 салдат. Я апрача функцыі намкама ўзвода, быў яшчэ і камандзірам табара.

29 снежня вечарам камандзір роты паклікаў мяне і загадаў прыгатовіцца да выезду ў Ветліну, завезці прадукты для ўзвода. „Паедзеш з салдатамі таму, што трэба пабачыць, як яны там і чаго ім трэба”, — сказаў паручнік Кучэўскі. Параіў яшчэ падабраць найлепшых салдат, бо дарога можа быць небяспечнай і трыццатага ранютка выехаць.

Пабудка ў шэсць і прыгатаўленне да дарогі. Пасля снедання — у дарогу. Зямля была замерзнутай, снегу дзе-нідзе. Неба зацягнута густымі цёмнымі хмарамі, з якіх вось-вось павінен пасыпацца снег. Вопратка наша незайздросная, бо ані кажуха, ані цёплага паліто, ані нават шкарпэтак у чаравіках не было. Салдаты наракалі і я ў гэтую раніцу быў згодны са сваімі падначаленымі — Юзкам Сыкутам і Меткам Таргоньскім, якія сядаючы на воз, нібы змовіўшыся, загаманілі: „Тыя файфусы, якія ніколі нічога не робяць, астаюцца ў цёплым памяшканні, а мы, к... мусім у такую пагоду ехаць трыццаць пяць кіламетраў... І калі мы вернемся?” Мне таксама не хацелася ехаць, бо пазаўчора дамовіўся з Юзяй Жураўскай на забаву ў Сільвестра на восем гадзін вечара. Ведаў, што здолею вярнуцца з Ветліны.

Толькі ад’ехалі пару кіламетраў за Балігруд, як пачаў сыпаць такі снег, што свету не было відаць. Заваліла дарогу так, што да Ціснай, семнаццацікіламетравы адрэзак дарогі мы пераадолелі пад вечар. Вярнуцца не можам — загад ёсць загад, а і калегі ў Ветліне не могуць быць без ежы, а ехаць фурманкай нельга, хоць ты плач. Дабраліся да Ціснай і я пайшоў у вёску шукаць санак. Знайшоў чалавека, які корпаўся на панадворку і папрасіў у яго санак, якія ўбачыў пад дашкам ля хлявоў. Той выпрастаўся, глянуў на мяне з нейкай насмешкай і загаласіў: „Ну, яшчэ чаго, мо і коней даць!?”. — „Не, коні ў нас свае, але возам па такім снезе мы далей не зможам ехаць, а ехаць мусова”, — гавару яму па-добраму. А той: „Калі мусіш, дык едзь, але санак я не дам, мне патрэбныя”. „Так, — гавару я, — але мне яны патрэбныя ўжо і не маю іншага выхаду, толькі прасіць у пана помачы”. „А я вам не абавязаны даваць помач, бо я сам толькі што вярнуўся з Англіі і помачы патрабую”. „Пане, — гавару, — я ў вас санак не забяру, толькі пазычу, а вяртаючыся аддам. Калі не дасце па-добраму, то рэквірую, бо не маю іншага выхаду”. „А паспрабуй пан, дык пабачым...” У той момант, калі мы спрачаліся, мае салдаты ўжо выцягалі санкі з-пад дашка і гаварылі: „Пан капрал, што вы будзеце з ім спрачацца— ён па-добраму не аддасць. Бярэм і ўсё, няхай бяжыць на міліцыю, або да Балігроду паскардзіцца”.

Выцягнулі санкі на вуліцу, перагрузілі мяшкі з воза ў санкі і пад акампанемент праклёнаў „англіка” падаліся ў дарогу, падбадзёраны, што цяпер ужо бяда нам нічога не зробіць. А снегу наваліла столькі, што санкі з мяшкамі танулі ў ім. А дзе былі заносы, коні ўжо не ішлі па іх, а проста білі ў хамут і скакалі. Ужо даўно сцямнела. Мы ідзем, трымаючыся за санкі, а коні паруюць. Дарогі нідзе ніякае не відаць, толькі пабабапал снежнай белі лес, з якога можна спадзявацца выхаду збройнай групы. Мы мелі аўтаматы, гранаты і па некалькі дыскаў амуніцыі, але гэта не давала нам ніякай абароны на снежным палатне. Тэрыторыя нам невядомая. На шчасце была тут праведзена тэлефонная лінія і мы меркавалі, што коньмі трэба кіраваць так, каб не з’ехаць у нейкае бяздонне. На конях пена, а і мы ледзь валочымся за санкамі. Не сядалі, бо коням і так было цяжка.

Недзе над раніцай санкі нам разляцеліся ў шчэпкі. Капылы не вытрымалі цяжару і пастаянных рыўкоў санак з горбы ў горбу. Што тут рабіць, калі не ведаем колькі кіламетраў да Ветліны. Але няма часу на пусты роздум: „Метэк, сядай на коней і едзь шукаць гэтай Ветліны. Памятай, прыглядайся тэлефоннай лініі, бо заблудзіш, або правалішся ў нейкую прорву”. Мы з Юзкам асталіся ля паламаных санак пільнаваць дабро. Швэндаемся вакол санак, бо ж холадна, не сядзеш. Гадзінніка ніхто не мае, і чорт яго ведае колькі часу няма Метка.

А ж бачым, едзе Метэк на санках нашай парай коней і вязе з сабою жаўнера з тамашняй часткі. Усе мы ўзрадаваліся, што ўрэшце даедзем. Да Ветліны асталося восем кіламетраў. Калі дабраліся на месца, там салдаты ўжо былі па снеданні. Я папрасіў камандзіра ўзвода даць паесці маім хлопцам, а сам выпіў кубак кавы і гавару: „Хлопцы, аставайцеся тут, няхай коні адпачнуць і самі выспіцеся колькі трэба. Можаце вярнуцца ў Балігруд заўтра, а я ўжо іду”.

Я закінуў аўтамат на плечы і гайда ў дарогу, каб паспець з Юзяй на забаву ў дваццаць гадзін. Снег спыніўся і я ішоў па сваіх слядах, брыдучы 64 кіламетры па высокіх сумётах. Калі ўжо сцямнела, на фоне белай пустэчы, дзе няма нават лесу, бачу групу людзей. А хто ў такую ноч можа ісці ў напрамку Ветліны? Але іду, зняўшы аўтамат з пляча, ім насустрач. Падыходзім нейкіх сто метраў да сябе і я першы, з аўтаматам гатовым да стрэлу, крычу: „Стой, хто ідзе!?” Яны адказваюць: „Пагранічнікі”. Ну, думаю, ізноў не пашчасціла мне быць пахаваным ў Балігродзе на жаўнерскім могільніку. Наблізіліся мы да сябе твар у твар, яны хлопаюць мяне па спіне і рагочуць: „Але ж КБВ, о то то КБВ!” Я яшчэ забыў сказаць, што яны мяне запыталі, хто я. Я адказаў: „КБВ”. Парагаталі нада мною, пахвалілі за адвагу, што сам пусціўся ў Ветліну ў такую дарогу. Паручнік папярэдзіў, што ў ваколіцы паявілася банда. Да Балігрода засталося дзве гадзіны.

Давалокся я да Балігрода тады, калі „мая” Юзя, не дачакаўшыся мяне, пайшла на забаву з іншым і з сястрой Тэрэзай. Я па просьбе Юзінай мамы, якая мяне не то што любіла, а проста кахала, распрануўся і памыўся. Сеў на ложак, каб памыць змучаныя ногі ў прынесеным паняй Жураўскай тазе і... заснуў. Пані Жураўская сама памыла мне ногі, накрыла пледамі. І так я адсвяткаваў свой першы Сільвестар. Іншыя таксама былі цікавыя, але ўсе вельмі прыкрыя і я іх перастаў святкаваць. Хлопцы вярнуліся вечарам 1 студзеня.

Васіль Петручук

PS. Мечыслаў Таргоньскі і Язэп Сыкут былі з Люблінскага ваяводства, з вёсак. Метка памятаю яшчэ і таму, што часта „хваліўся”, што ён з Лукаўкі каля Любартова, а Юзка з таго, што не мог пераносіць, як і я, калі хтосьці нарабіў нечага дрэннага, а не прызнаваўся. Ён тады гаварыў: „Самі срата, а на кота зганята”.

Ліцэіст-карэспандэнт

Курсанты перад рэстаранам „Людова”. У цэнтры (за дзяўчынай) — Ян Кубаеўскі.

Успаміны Яна КУБАЕЎСКАГА, пенсіянера з Орлі, аб працы карэспандэнта.

Вучыўся я ў 1950 гадах у беларускім ліцэі ў Бельску-Падляшскім. Арыфметыка давалася мне туга, але пісаць я вельмі любіў. Мае сачыненні настаўнікі ставілі ва ўзор усяму класу, пачаўшы ужо з падставовай школы. Памятаю сачыненне пра далейшыя лёсы Янка Музыканта. Ён пайшоў у свет і... трэба было фантазіраваць. За ноч запісаў я цэлы сшытак. Усе захапляліся маёй фантазіяй.

У 1951 годзе „Газета Беластоцкая” аб’явіла конкурс на фельетон месяца. Прыняў я ў ім удзел. Мой фельетон аб школьным спорце заняў першае месца. Конкурс доўжыўся год і лаўрэаты з паасобных месяцаў былі запрошаны на 2-тыднёвыя курсы карэспандэнтаў у Беластоку. На журналісцкіх занятках вучыліся мы збіраць матэрыялы, апрацоўваць іх, знаёміліся з працай друкарні.

Курсы праводзіліся ў днях 1-14 ліпеня 1952 года. Начавалі мы ў гатэлі ці ў інтэрнаце, гэтага не памятаю, але сталаваліся ў рэстаране „Людова”. Цяпер гэта „Astoria”. Заняткі праводзіліся па горадзе, збіралі мы матэрыялы і пісалі артыкулы. І нас ацэньвалі. Курсы з ліку 12 удзельнікаў пазітыўна закончылі толькі 3 асобы, а ў тым ліку і я. Атрымалі мы магчымасць працаваць уласнымі карэспандэнтамі газеты. Астатнія таксама маглі супрацоўнічаць з „Газетай Беластоцкай” з той розніцай, што мы (3 асобы) сталі пастаяннымі карэспандэнтамі з правам уступу на заводы.

Памятаю, што ў 1950-х галоўным рэдактарам быў Паўлята. Ён закончыў журналісцкія курсы ў Маскве. Сакратаром у газеце быў Уладзімір Хацей, а лакальнымі справамі займаўся Генрык Кашковяк. На пасведчанні заканчэння курсаў, якое ў мяне захавалася, падпісаны М. Матэйчык — кіраўнік аддзела лістоў і інтэрвенцыі.

Ці нам плацілі за пісанне? Не плацілі, карэспандэнты гэта былі аматары. Пісаў я многа, можа сотні допісаў дасылаў, асабліва многа пра Орлю. Магу таксама сказаць, што пасля стылістычных правак публікаваліся. Быў я тады вучнем сярэдняй школы і то была праца, да якой і сёння мяне цягне.

Запісаў Міхал Мінцэвіч

Фота з архіва Яна Кубаеўскага

Аб лекарскіх практыках

Калі лекары даставалі і патрабавалі павышэння зарплаты, грамадства было падзелена. Адны падтрымоўвалі медыкаў — другія махалі рукою, кажучы: „А ці ім кепска?”.

Лекары, у асноўным спецыялісты, якія працуюць у публічных амбулаторыях, арганізавалі прыватныя кабінеты. Васьмігадзінны дзень працы ў дзяржаўнай установе належыць да абавязку. Да пацыентаў тады ставяцца холадна дзеля таго, каб знеахвоціць чалавека і, каб шукаў ён паратунку ў прыватным кабінеце. У выніку пацыент трапляе да таго ж спецыяліста ў ягоным прыватным кабінеце і атрымоўвае там належную ветлівасць і пашану.

Дачка мая перад родамі другога дзіцяці пачала кансультавацца з бельскімі лекарамі, бо сказала, што ў Гайнаўцы атрымала неакуратную дапамогу. Спатрэбілася спецыялістычная кансультацыя, зарэкамендавалі ёй „вядомага” гінеколага ў Беластоку. Першы візіт абышоўся за 80 зл. Запісанае лякарства некарысна паўплывала на арганізм. Пасля наступнага візіту зноў „вылятае” з кішэні 50 зл. На працягу месяца вымушана яна была заплаціць 180 зл. Нічога не палепшылася і грошай няма. Хто адкажа на пытанне: калі пацыент атрымае належную медычную дапамогу ў сямейнага лекара або спецыяліста ў публічнай амбулаторыі, каб той не выкідаў грошай у прыватных кабінетах? А мо міністр аховы здароўя знойдзе „цудоўны” рэцэпт на гэту хваробу?

Уладзімір Сідарук

Вер – не вер

Астроне, дарагі! Я вельмі перапужалася, калі прысніўся мне такі сон. Быццам мы з мужам знаходзімся ў сваёй кватэры, якая складаецца ні то з двух пакояў, ні то з пакоя і пярэдняй (у сапраўднасці ў нас зусім іншая кватэра, але я ў сне адчуваю, што я дома).

Стоячы ў той пярэдняй (а можа кухні), я, глянуўшы праз акно на неба, убачыла, што ў напрамку нашай кватэры ляціць вялізны бела-чорны арол з кіпцюрамі. Яшчэ хвіліна — і тая птушка ўлятае ў нашу пярэднюю праз адчыненае акно. Я перапалохалася, а птах ужо ў пакоі. Рассеўся на крэсле, мы з мужам пераглядваемся, а гэта ж ужо не арол, а нейкая жанчына сядзіць. Яна ў шматколернай сукенцы, на галаве ў яе — чубчык, як у нейкага папугая.

Жанчына гэта маладая, яна ўсё нешта гаворыць і гаворыць, але я ведаю, што яна круціць, бо я ўбачыла, што ў яе не ногі, а кіпцюры, як у арла. Яна гэтыя кіпцюры старанна прыкрывае сваёй доўгай, стракатай сукенкай. Пачуццё страху не пакідае мяне. Наводзіць жах тая птушка-жанчына, няпрошаны ў нашым доме і няшчыры госць.

Скажы, Астроне, што мяне чакае? Я вельмі баюся, што сон прадвяшчае кепскі ход падзей.

Анна

Анна! Во калі б табе прыснілася проста птушка! Абазначала б гэта, што чакае цябе неспадзяваная радасць. Але табе прысніўся арол, што таксама прадвяшчае добрае: менавіта славу і багацце.

Ды толькі вось бачыш, што твой арол ператварыўся ў жанчыну, а яна мае далёка не аднолькавае значэнне. Жанчыну маладую, прыгожую сніць — радасць і задавальненне; старую, брыдкую — плёткі, смутак, журба.

Цяжка інтэрпрэтаваць жанчыну, якая табе прыснілася, бо яна ў цябе і маладая быццам бы, але ж нейкая ненармальная: на галаве ў яе чубчык, быццам у папугая, а ногі зусім як у арла, з кіпцюрамі.

Я мяркую, што ў тваім становішчы (дзе і слава, і багацце) адбудуцца нейкія змены, а дапамогуць у гэтым нядобрыя людзі, драпежныя, як тыя ногі-кіпцюры жанчыны. Яны замуцяць твой спакой сваімі плёткамі, а ты з гэтай прычыны толькі засмуцішся.

Астрон

Пра штодзённыя справы

У час XXXI сесіі Рады Гайнаўскага павета, якая адбылася 6 снежня мінулага года, радныя аб'явілі другі конкурс на пасаду намесніка дырэктара Самастойнага публічнага Комплексу аховы здароўя ў Гайнаўцы, размеркавалі сродкі Павятовага фонду аховы асяроддзя, абмеркавалі арганізацыю новага фестывалю царкоўнай музыкі ў Гайнаўцы і факт знішчэння ў Новаберазове помніка Юзэфу Пілсудскаму.

Радны Віктар Рэент паінфармаваў, што продаж алкаголю ў магазінах Прадукцыйнага кааператыва „Рольмак" у Гайнаўцы скараціўся ажно да 30%. Прычына гэтаму — гандаль на базары гарэлкай без акцызнай маркі. Прапанаваў прыняць меры па барацьбе з нелегальным гандлем алкаголем і продажам харчтавараў у негігіенічных умовах. Староста Уладзімір Пятрочук звернецца ў гэтых справах у Павятовую камендатуру паліцыі і Санітарна-эпідэміялагічную станцыю ў Гайнаўцы. У час пасяджэння Рады высветлілася, што размовы паміж уладамі горада Гайнаўкі і вясковай гміны Гайнаўка ў справе будовы вадасховішча на рэчцы Лясная на ўскраіне горада ўступілі ў завяршальны этап. Найбольш верагодным становіцца вырашэнне, што тэрыторыя, якая падыходзіць найбольш для будовы вадасховішча, будзе вясковай гмінай Гайнаўка перададзена гораду. Тады ўлады Гайнаўкі стануць інвестарам будовы вадасховішча.

Радныя прагаласавалі за выдзяленне з Павятовага фонду аховы асяроддзя па 12 тысяч злотых Гайнаўскай і Дубіцкай гмінам у якасці дапамогі ў рэалізацыі праграм размеркавання камунальных адкідаў. У час сесіі радныя пазнаёміліся з праектамі герба Гайнаўскага павета, выкананымі Збігневам Будзынскім (зубр на фоне аднаго або некалькіх лісткоў дуба). Праекты гэтыя будуць перададзены на кансультацыю ў Геральдычную камісію ў Варшаве.

Адзін з радных выявіў абурэнне па факце знішчэння помніка Юзэфу Пілсудскаму ў Новаберазове. Стаяў ён побач былога школьнага будынка. Старшыня Рады Гайнаўскага павета, якая заадно з'яўляецца войтам Гайнаўскай гміны, Вольга Рыгаровіч сказала, што помнік, мабыць, знішчылі вандалы, якія разраджаюць свае эмоцыі, разбураючы аўтобусныя прыпынкі і помнікі. Староста паінфармаваў, што Староства надалей падтрымлівае прапанову стварэння Марской школы ў Гайнаўцы, а справу верагоднасці яе стварэння Куратораў асветы ў Беластоку. Пры канцы пасяджэння завязалася дыскусія наконт Гайнаўскіх дзён царкоўнай музыкі. Староста раіўся ў радных ці павінен ён як прадстаўнік Староства ўваходзіць у аргкамітэт Дзён царкоўнай музыкі. Намеснік старшыні Рады Гайнаўскага павета і дырэктар Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі Мікола Бушко праінфармаваў пра ягоныя перамовы з мітрапалітам Варшаўскім і ўсяе Польшчы Савам у справе фестывалю і заявіў пра сваю гатоўнасць арганізаваць сёлета Міжнародны фестываль у нязмененай форме. Прапанавалася, каб радныя ў галасаванні выказаліся за фестывалем або днямі царкоўнай музыкі. Аднак радныя, без галасавання і вырашэння справы, дыскусію закрылі.

Аляксей Мароз

Экалагічнае харчаванне

Летам даводзілася мне пабываць час ад часу ў Беластоку. Аднойчы зайшоў я на таўкучку што па вуліцы Юравецкай, каб купіць сабе рускія сігарэты. Яны таннейшыя за нашыя айчынныя, а, вядома, што ў вясковага пенсіянера няма замнога грошай. Купіўшы сігарэты і маючы яшчэ свабодны час надумаўся прайсціся ды паглядзець колькі каштуе агародніна на ларках. Сустрэў там знаёмых прадаўцоў. Крыху пастаяў і прыгледзеўся, як яны прадаюць ды захвальваюць свой тавар. Даведаўся, што беластоцкія камерсанты едуць на гелду ў Груец, там купляюць, напрыклад, агуркі па 20 грошаў за кілаграм, памідоры па 50 гр. і прывозяць на гелду ў Беласток. Тут оптам прадаюць агуркі ўжо па 50 грошаў, а памідоры па 1 зл. за кілаграм. Тут жа купляюць агародніну беластоцкія гандляры і прадаюць на базарах зарабляючы яшчэ у 100%. А як захвальваюць агародніну, маўляў, гэта экалагічны, без штучнага ўгнаення, вельмі добры і смачны тавар. Калі я спытаў знаёмага прадаўца ці ён бачыў, дзе рос яго „тавар", дык пачуў адказ: „Мне так казалі".

І мне тут, як селяніну, адразу прыйшла думка ў галаву, што ў нас нідзе няма экалагічнай агародніны, яблыкаў, груш, сліў, вішань ды бульбы. Бульбу сяляне падсыпаюць азотным угнаеннем, каб мець большы ўраджай, потым апырскваюць хімікатамі, каб панішчыць каларадскага жука, а гэта ўсё пранікае ў зямлю. Агуркі, памідоры, моркву ці капусту кожны агароднік вырошчвае таксама на штучным угнаенні і некалькі разоў апырсквае хімікатамі ад заразы ды мошкі. Садавіну таксама апырскваюць па некалькі разоў рознымі хімікатамі, каб лепш абрадзіла, ды каб панішчыць усякае насякомае.

На маю думку пройдзе яшчэ шмат часу, пакуль станем спажываць экалагічныя прадукты харчавання, а, вядома, чакае гэтага ўсё насельніцтва краіны.

Мікалай Лук'янюк

Адстрэл зуброў

Неўзабаве пачнецца адстрэл зуброў у Белавежскім нацыянальным парку, у адпаведнасці з дазволам Міністра аховы асяроддзя. Цяпер заканчваецца чарговы штогадовы падлік зуброў. Каб быць пэўнымі, леснікі лічаць звярыну штука за штукай тры разы. Ужо стала вядомым, што ў пушчы зуброў замнога на 100 асобін. Толькі за мінулы год на свет прыйшло больш за 60 цялят.

Абмежаванне пагалоўя зуброў у Белавежскім парку да 250 штук вынікае з недахопу кармоў у лясах, у якіх могуць вадзіцца зубры. Гэтай зімы пад адстрэл пойдзе 50 зуброў — старых (самка дажывае 25 гадоў), слабых, хворых, пацярпелых у выпадках. Шкуры застрэленых зуброў трапяць у музей і на продаж.

На свеце жыве 3 000 зуброў, у тым ліку ў Польшчы 600-700 штук. Гэты выратаваны від (у 1924 годзе на свеце было іх толькі 54 штукі) без умяшання чалавека немагчыма ўтрымаць у дзікім стане. Яго стабільнае развіццё з-за малой генетычнай разрозненасці гарантуюць толькі вялікія статкі больш за 1 500 штук. Такую колькасць самых вялікіх траваедных жывёл немагчыма было б пракарміць і таму чалавек будзе вымушаны рабіць тое, што даўней рабілі натуральныя ворагі зуброў — мядзведзі і ваўкі.

Міхал Мінцэвіч

Пад музыку і спеў Кавальскіх

Дом турыста „Тры сасны" ў Ігнатках так як у мінулым годзе арганізаваў навагодні баль. 31 снежня пасля 19 гадзіны дзве адмыслова ўпрыгожаныя залы пачалі напаўняцца беластачанамі. Прыбыло больш за 200 чалавек моладзі і старэйшых. Кожная пара прыйшла са сваім кошычкам, нягледзячы на тое, што арганізатар запэўніў гарачыя стравы, гарбату, каву і шампанскае ў рамках запрашэння — за 170 злотых ад пары.

А 20 гадзіне распачаў свой канцэрт „Лідэр" — музыкальна-вакальны трохасабовы гурт братоў Кавальскіх з Крыўца, што на Гайнаўшчыне. Закружыліся пары — вясёлыя, задаволеныя. Чатыры гадзіны 2001 года ўдзельнікам балю хутка мінулі.

У апошнія мінуты старога года пачалі страляць коркі шампанскага. Паплылі віншаванні і зычанні. У гэтым нязвыклым настроі, які панаваў у зале, і які бывае адзін або два разы ў год, у маім сэрцы паявіўся боль: чаму не магу я павіншаваць пакойную жонку, так як гэта было шэсць гадоў таму. Майго смуткавання ніхто не заўважыў, бо я так хацеў. А браты Кавальскія далей ігралі і спявалі, пераплятаючы песенны рэпертуар забаўнымі анекдотамі, гульнямі, якія выклікалі многа смеху. Ігралі яны ў Доме турыста таксама і на Новы год па старым стылі, г.зн. з 13 на 14 студзеня.

Міхась Хмялеўскі

Заззяла звыш 1 000 новых электралямпачак

Зараз 1 055 новых электралямпачак вулічнага асвятлення свеціць усю ноч у вёсках Міхалоўскай гміны. У снежні мінулага года гмінныя ўлады за 350 тысяч злотых заманціравалі новае вулічнае электраасвятленне. Гэта і таму, што новыя сучасныя электралямпачкі расходваюць значна меншую колькасць электраэнергіі. Дагэтуль усё яшчэ толькі нешматлікія гміны на Падляшшы вось гэтак комплексна замянілі старыя электраўстаноўкі вулічных ліхтароў на новыя.

Варта адзначыць, што ў вёсках, дзе ноччу відна на вуліцы, менш бывае крадзяжоў, узломаў і разбояў. Вядома, святло адпужвае зладзеяў. (яц)

Аб'ява

Куплю гарчыцу і кмен, 0604242840.

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl* альбо: *niva_bielastok@skrzynka.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury i Dziedzictwa Narodowego.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Тэкстоў nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2002 r. upływa 5 marca 2002 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na II kwartał 2002 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą lotniczą: Europa — 5,30 (68,90), Ameryka Płn., Afryka — 5,90 (76,70), Ameryka Płd., Środk., Azja — 6,50 (84,50), Australia — 8,30 (107,90). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Ніўка

http://www.anekdotov.net/

Пенсія

(экспромт з Беларусі)

Бабка, ўзяўшы пенсію, стала галасіць:
— Як магу я сёння за яе пражыць —
Заплаціць квартплату, за святло і газ?..
Ах, які нялёгкі наступіў жа час.
Дзед з-пад акуляраў глянуў на квіток:
— Ой, зацісну туга свой я паясок...
Памаўчаў хвілінку і як закрычыць:
— Прэзідэнта выбары трэба паўтарыць!

Сяргей Чыгрын

Крыжаванка



Гарызантальна: 4. шырокая лапата для перасыпання рэчываў, 7. помнік у выглядзе гранёвага слупа, 8. раздзел фізікі, вывучаючы ўласцівасці святла, 9. горад на паўднёвым усходзе Галандыі, 10. сталіца Эрытрэі, 14. прылада для дакладнага вымярэння даўжыні, 18. пара Руслану, 19. Ганджэві, азербайджанскі паэт (к. 1141-1209), 20. няўмека, бездар, 21. мова эфіопаў.

Вертыкальна: 1. прозвішча аўтара „Гяура”, 2. клетка, якая выпрацоўвае нервныя імпульсы, 3. вялікая японская выспа, 4. пашкоджанне, страта, 5. непазбежная сіла лёсу, 6. урач, 11. выносіць прыгавор у судзе, 12. палітычны пасланец у замежжа, 13. падбярозавік, 15. наркатычны сок з няспелых галовак маку, 16. выспа Адысея, 17. вадкасць у роце для змочвання і пераварвання ежы.

(Ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 49 нумара

Гарызантальна: лішак, праўнучка, паста, Мазыр, лад, багацце, Апеніны, сем, апора, лётка, апанентка, аднос.

Вертыкальна: пшаніца, Лхаса, Кучум, пастанова, адзінства, Прага, ронда, лес, Дам, екценне, Адана, лотас.

Рашэнне: **Усё мінецца, адна праўда застанецца**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Зубры

Каб добра выпіць, трэба мець здароўе. Не гавару ўжо пра грошы. А чаму чалавек п’е? Можа, таму, што любіць смак горкага і нясмачнага, або якраз праз тыя грошы, якіх няма. Квадратура кола. П’еш, бо мусіш, п’еш, бо можаш, п’еш, бо хочаш, п’еш, бо не хочаш, ды мусіш... А грошы, як то грошы. У нас галоднаму хлеба не дадуць, тым больш лустачкі хлеба з маслам, але чарку нальюць, шкадуючы. Не шкадуючы нават уласных грошай, каб даць патолю беднаму бліжняму, сасмагламу і нешчасліваму. А той, хто прывык, што яму ўсё даюць, будзе чакаць, што яму дадуць, пасля нават дзякуй не скажа, а пасля яшчэ сам возьме, сілай, так сказаць, укусіць руку, якая яму на шкадавала. Так ёсць не толькі ў матэрыяльных справах, але і ў духоўных (хоць той *спірытус* таксама ці не з гэтай сямейкі...). Ёсць зладзеі ідэй, часу, думак, пачуццяў, якія ім падаюцца на іх жаданне, просьбу або і не.

Але, каб напіцца, дык трэба быць добрым зубром, дый яшчэ якім! Здароўе! Мацата! Адвага! Рызыка! Пасля і мора па калені. А паглядзіць такі пасля (не кажу пра пахмелку) на сябе ў люстэрка — і куды падзеліся тая адвага, тая краса і моц! А, можа, іх і не было...

Не ведаю, як з жанчынамі. Кажуць, яны моцныя, мацнейшыя за нас, мужыкоў. Але калі дама стане даваць сабе чаду з „узмацняльнікамі”, дык хутчэй яшчэ на дно апусціцца, чым любы асобень адваротнага полу. Таму лепш, калі кабета мае цягу хай і да малявання сабе твару ў ваяўнічыя колеры, фарбавання валос, выдавання грошай на адзенне, дык хай робіць гэта, а не частуецца зачаста чарачкай. Але ж і іх жыццё дзяўбе, можа і больш чым мужыкоў, і досыць лёгка зрабіць сабе палёгку, лёгенька кульнуўшы той „дух”. Дзеля падтрымкі свайго духа. Агата мая, на жаль, мае цягу да такога наркотыка, як кава. Кажа, таму, што павышае ёй ціск. Пасля каўкі мая жонка накручваецца так, што робіць усё хуценька як малы трактарчык. З усім тады спраўляецца, нават і са мною. Тады нават наша сучачка не цягне яе на павадку на прагулцы, а Агата спераду бяжыць як малая ракета. Ды пасля, калі ўжо кава ёй выветрае з галавы ды зноўку спавальнее кроў, Агата мякчэе. І тады тая квадратура кола зноўку ўключаецца, Агата напіваецца кавы, пасля пятага кубачка наступае кавовае *delirium* разам з дрыжыкамі і прывідамі кавовых мышак. Тады мне толькі з хаты ўцякаць. Агата ў тым стане можа перакульваць горы.

Па-зуброўску накручвае мяне трайны пітны мёд. Такім я пачаставаўся на выстаўцы фотаздымкаў Якуба Смольскага з неіснуючай ужо вёскі Лукі ў Нараўчанскай гміне. Тая мядовая кропля, а, можа, і не яна на мяне так паўплывала, што ажылі мае лучанскія ўспаміны і краявіды. Выстава — адметная. Заходзьце ў ратушу ў Беластоку, можа, пазнаеце там сваіх знаёмых, сваякоў. Бо, на жаль, рассыпаліся лучане па ўсім свеце са свае, пакінутае на беразе былое Нарвы, вёскі, хто памёр... Будзе выдавацца фотаальбом Якуба Смольскага з партрэтамі лучан і суседзяў, і было б варта, каб іх твары сказалі таксама свае імёны. Вось, быў зубёр Якуб Смольскі, сын Юстыны і Канстанціна, кравец, фатограф, карэспандэнт газет. Здаецца, яму не трэба было штучнага *спірытуса*, бо меў ён тамака ў Луцэ той дух месца, які яго натхняў. І меў здароўе, хоць кульгаў. І ніякі злодзей думак і часу яму на пагражаў. Толькі час нас змяніў, як той краявід.

Вандал Арлянскі

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

— Андрэй! Ці хочаш ажаніцца з Марусяй, якая стаіць побач цябе? — пытае ксёндз.

— Не! — рашуча адказвае жаніх і хутка выходзіць.

— Як ксёндз мог так зрабіць?! — дакарае святара цешча. — Айцец быў адзінай асобай, якая пра такое спытала!

* * *

Ксёндз праходзіць побач дзяцей.

— У што гуляеце? — цікавіцца.

— У татку і мамачку, — адказвае дзяўчынка.

— А што робіць гэты старшэнны бульдог між вамі?

— Гэта мая цешча, — адказвае хлопец.

* * *

Гутарка закаханых:

— Дарагая, ці будзем магчы жыць у тваіх бацькоў, калі пажэнімся?

— Гэта немагчыма; яны таксама жывуць яшчэ ў сваіх бацькоў.

* * *

Хворага Янку наведвае Аня. Дзверы кватэры адкрывае ёй пажылая жанчына і цікавіцца асобаю госці.

— Я з’яўляюся сястрою Янкі! — заяўляе Аня.

— Вельмі я рада пазнаёміцца з вамі. Я з’яўляюся Янкавай мамай.

* * *

Балельшчык да жонкі:

— Здалося мне, што хочаш нешта сказаць перад пачаткам футбольнага сезона...

* * *

Гутараць дзве сакратаркі:

— Які твой нарачоны?

— Цудоўны! Мае сінія вочы па маці і белы „Мерседэс” па бацьку.

* * *

— Я рашыла выйсці замуж да трыццаці гадоў.

— А я рашыла, што не скончу трыццаці гадоў, пакуль не выйду замуж.

* * *

— Ці ты задаволена сваім нарачоным?

— Нават вельмі. Нядаўна купіў мне футра і пярсцёнак з брыльянтам, а ўчора зрабіў мне прапанову.

— Які мудры! Адразу дайшоў да вываду, што задорага яго каштуеш.

* * *

— Пра што сёння бацюшка гаварыў? — пытае маці дачку, якая вярнулася з царквы.

— Пра Адама і Еву; хіба зноў нейкія анекдоты.

* * *

Мытнік да манаха:

— Што ў гэтай бутэльцы?

— Вада з цудадзейнай крыніцы.

— Ой, гэта не вада, толькі каньяк.

— Ох, Усявышні! Не ведаю, як Табе дзякаваць, што замяніў ваду ў каньяк!

ISSN 0546-1960